№ 43 (641) 18 лістапада 2009 www.nn.by

незалежная газета

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе 1906. Адноўленая ў маі 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады




**Таміфлю дапамагае, рэмантадзін і арпетол — не**

Старонка 5



**Маладую доктарку забіў муж?**

Старонка 7



**«Хто не ўвойдзе ў ЕС, застанецца бензінавым шлангам»**

Старонка 9

## У НУМАРЫ

**На «Інтэграл» наехалі дарэмна**

Разнос Аляксандра Лукашэнкі пакрыўдзіў працаўнікоў завода. **Старонка 2.**

**Мядзведзеў запрасіў да сябе журналістаў незалежных СМІ Беларусі**

Сустрэча прэзідэнта Расіі з беларускімі журналістамі адбудзецца 23 лістапада. **Старонка 3.**

**Падатковая пачынае масавую праверку асобаў**

якія атрымліваюць заробак, меншы за два пражытковыя мінімумы. **Старонка 4.**

**Рэч Паспалітая і Расія: хто перамог?**

Пра кнігу «Рэспубліка супраць Аўтакратыі: Рэч Паспалітая і Расія ў 1686—1697 гадах» піша Алег Дзярновіч. **Старонка 12.**

**Інтэрнэт у нашых пасцелях**

Раней трэба было застукаць мужа/жонку з кімсьці, цяпер можна знайсці інтымную перапіску ў скайпе. **Старонка 6.**

«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — глядзі **старонку 2**.

# Карупцыя ў медыцыне

З 93 кватэр у Каменнай Горцы 40 дасталіся супрацоўнікам Міністэрства аховы здароўя, і толькі астатнія 53 — медработнікам. А таксама: рэктар Медуніверсітэта пратэстуе супраць беззаконня ў сістэме аховы здароўя. **Старонка 8.**




СЯМЁН ПЕЧАНКО



**Пацыфіст? У чыгуначныя войскі!**

Альтэрнатыўная служба дазволеная, але немагчымая. **Старонка 7.**

# Інтэграцыйныя клятвы забытыя

**Лукашэнка: Удзел у Мытным саюзе з Расіяй можа пярэчыць нацыянальным інтарэсам.**

18 лістапада ў графіку Аляксандра Лукашэнкі значылася нарада па фармаванні Мытнага саюза. Шараговая, здавалася б, падзея скончылася нечаканымі заявамі.

Лукашэнка заклікаў урад перагледзець дасягнутыя дамоўленасці па фармаванні Мытнага саюза Беларусі, Расіі і Казахстана: «Шчыра скажу, мяне турбуе, ці дастаткова абаронены і ўлічаныя беларускія эканамічныя і замежнапалітычныя інтарэсы на этапе ўзгаднення ўмоваў Мытнага саюза».

Кіраўнік краіны зазначыў, што і Расія, і Казахстан выбілі сабе палажэнні, якія адпавядаюць іх інтарэсам.

Лукашэнка пацікавіўся, як ідуць справы з Адзіным мытным тарыфам, які плануецца ўвесці налета. «Ці зроблены дакладныя разлікі па кожнай таварнай пазіцыі на прадмет магчымых выгод або страт?»

Лукашэнка зазначыў, што саступкі непазбежныя, але яны павінны быць узаемнымі і збалансаванымі. «А ў нас на сёння няма ніякай яснасці ні па пытанні аб адмене экспартных мытаў на нафту, якія ўжывае Расія, ні па адзіным цэнаўтварэнні на прыродны газ», — ці не ключавое прызнанне Лукашэнкі. На чорта той саюз, калі цэны на газ меншымі не будуць?

Ён адзначыў таксама, што і Расія, і Казахстан маюць магутныя сыравінныя рэсурсы, і таму іх эканомікі будуюцца інакш, чым беларуская. Вось калі б у саюзе была Украіна, з якой у Беларусі падобныя эканомікі, весці перамовы было б прасцей, разважаў Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы таксама растлумачыў, што «пры ўдзеле ў Мытным саюзе Беларусь страчвае частку свайго эканамічнага суверэнітэту ў пытаннях гандлёвых адносін з трэцімі краінамі і ў нейкай меры ставіць некаторых айчынных таваравытворцаў пад пагрозу». Канчатковае рашэнне аб уступленні, падкрэсліў Лукашэнка, яшчэ не прынятае. «Любая памылка і пралік будуць дорага каштаваць краіне і народу», — казаў ён міністрам.

**Працяг на старонцы 3.**

# На «Інтэграл» наехалі дарэмна

Разнос Аляксандра Лукашэнкі пакрыўдзіў працаўнікоў завода.

Інжынерна-тэхнічны супрацоўнік ВА «Інтэграл» на ўмовах ананімнасці пагадзіўся распавесці пра асаблівасці субмікроннай вытворчасці і пракаментаваць абвінавачванні ў марнатраўстве сродкаў, якія Аляксандр Лукашэнка паказальна агучыў на ўсю краіну падчас наведвання прадпрыемства.

«Праект «Субмікрон К» — гэта вытворчая лінія, прызначаная для апрацоўкі паўправадніковых пласцін дыяметрам 200 мм з мінімальнымі праектнымі нормамі (мінімальнымі памерамі элемента) 0,35 мк. Для параўнання, таўшчыня чалавечага воласа 35 мк — то бок у 100 разоў большая. Без гэтай лініі «Інтэграл» нікому не патрэбны. Яе ўсталяванне — жыццёвая неабходнасць.

Абсталяванне для лініі вельмі дарагое. Тых сродкаў, што былі выдзеленыя, хапіла толькі на самае неабходнае. Але на тое, каб абсталяваць лінію паўнацэнна і сучасна, грошай проста не хапіла. Таму прыходзіцца дадаткова выкарыстоўваць абсталяванне са старой лініі. Але ўсе гэтыя праблемы, у прынцыпе, вырашаюцца, і лінія, хаця і не ідэальна, працуе. Прадукцыі пакуль сапраўды няма, але да лета ўсё будзе даведзена да ладу і прадукцыя пойдзе.

Праблема ў іншым. Куды яе прадаваць? Паўсюль крызіс. На лініі будзе стварацца прадукцыя як вайсковага, так і цывільнага прызначэння. І калі вайсковая прадукцыя купляецца незалежна ад цаны, то для рэалізацыі прадукцыі грамадзянскага ўжытку трэба, каб яна была рэнтабельнай. Але пакуль не дапрацаваны тэхпрацэс, няма прымальнага працэнту выхаду годных мікрасхем. А працэс дапрацоўкі доўгі.

Тыя лічбы, што называў Лукашэнка — 300 млрд рублёў за 4 гады — гэта 100 млн даляраў. Палова гэтай сумы пайшла на новы энергацэх. Гэта была інвестыцыя ў асноўныя фонды, ад якіх нельга чакаць прыбытку. Для параўнання: аналагічную лінію запускаюць масквічы. У іх інвестыцыі склалі 200 млн еўра за два гады. Або падобная фабрыка запускалася дзесяць гадоў назад у Дрэздэне фірмай AMD — яны інвеставалі 4 млрд даляраў. Так што сума, якая была выдзеленая, насамрэч невялікая. Магчыма, яе можна было выкарыстаць больш эфектыўна, але ў нашых умовах зрабіць гэта складана. З гэткімі ж праблемамі сутыкаюцца і іншыя прадпрыемствы. Чаму толькі чатыры дні ў тыдзень працуе МАЗ, чаму стаіць гадзіннікавы завод, велазавод? Мусіць, справа не столькі ў «Інтэграле».

Я лічу, што наехалі на «Інтэграл» дарэмна. Але што зробіш? Трэба ставіцца да гэтага, як да надвор'я. Прыродныя ўмовы ў Беларусі такія».

**Запісала Наталля Бабіна**

**У Японіі аналагічныя заводы**

будуюць у адкрытым моры на сваях. Так вырашаюць праблему пылу. Для вытворчасці мікрасхемаў патрэбная стэрыльнасць. У высокатэхналагічнай вытворчасці ёсць і шмат іншых тонкасцяў.



**«Інтэграл» асвойвае вытворчасць пласцін з мінімальнымі памерамі элемента ў 100 разоў меншымі за таўшчыню воласа.**

КАМЕНТАР РЭДАКЦЫІ

## Якая мэта разносу?

У Мінску пайшлі чуткі, што проста на прахадной «Інтэграла» турнікет выпадкова прыцісную Колю — да сінякоў, што і сапсавала гумор тату. Надта ж неадэкватнымі выглядалі наезды на кіраўніцтва завода. Субмікронная мікрасхема — не плот. Яе без абсталявання не зварганіш. А калі і зварганіш, дык не прадасі. У чым жа справа, калі сур'ёзна?

Справа магла быць у прыватызацыі. Ураду трэба новая крэдытная праграма МВФ. Яе адкрыюць толькі пры ўмове пачатку прыватызацыі. Але ж распродаж заводаў пярэчыць ранейшым ідэалагемам. Вось і пачалася тэрміновая апрацоўка насельніцтва ў новым духу. Мабыць, нашто трымацца за стратныя прадпрыемствы? Давайце аддамо іх уласнікам гатовых тэхналогій. Першы квартал 2010 года пакажа, ці мы маем рацыю з такім тлумачэннем.

СЦІСЛА

### Старых свіны грып не бярэ

Група амерыканскіх навукоўцаў правяла параўнанне структуры вірусаў сезоннага грыпу 1988—2008 гг. з новым вірусам свінога грыпу. Аналізы паказалі, што людзі сталага ўзросту, арганізм якіх «памятае» папярэднія эпідэміі, пераносяць свіны грып лягчэй у выпадку захворвання. Падабенства вірусу H1N1 да папярэдніх «версіяў» дазваляе ахоўным сістэмам арганізма выкарыстоўваць «імунную памяць», якая прытупляе дзеянне інфекцыі.

### Частка старога Мінска стане пешаходнай

Скразны праезд па вуліцы Камсамольскай ад Інтэрнацыянальнай да Нямігі будзе зачынены. Пешаходную зону забрукуюць і паставяць ліхтары.

### У Віцебску шалёны сабака пакусаў 25 чалавек

Невялічкі чорны сабака кідаўся на ўсіх сустрэчных-папярэчных. Пры гэтым ён не брахаў — прыкмета хваробы. Гэта здарылася ў самым цэнтры горада, каля вакзала. На выхадных спецбрыгада адлавіла сабаку, падобнага да таго, што кусаў людзей. У горадзе ўзнікла сур'ёзная эпідэміялагічная пагроза, бо невядома, колькі жывёлаў пакусаў ашалелы цюцька.

### Прычына крушэння застаецца таямніцай

Адна з «чорных скрыняў» самалёта расійскай кампаніі «С-Эйр», што разбіўся ля аэрапорта «Мінск», не падлягае расшыфроўцы. Другая — яна запісвала перамовы пілотаў — захавалася лепей.

**Сяргей Гезгала; інф. «Народных навін Віцебска», БЕЛТА, «Мінск-навіны»**


# Не ўсё ў жыцці апошні раз

**Падпісацца можна праз Рэдакцыю і праз «Белпошту». Мы рэкамендуем — праз Рэдакцыю**

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае **6000 рублёў**.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Усе тыя, каго такі спосаб атрымання газеты задавальняе, хай застаюцца вернымі такой падпісцы.

Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — **63125**, для прадпрыемстваў — **631252**. Падпісацца можна на кожнай пошце. Цана гэтай падпіскі — 8 520 руб. на месяц.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак:

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | |
| | | | | |
| | | | | |

Агулам

Касір

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак:

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

КВІТАНЦЫЯ

| Від аплаты | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | |
| | | | | |
| | | | | |

Агулам

Касір М.П.

**Каб штотыдзень атрымліваць газету,**

дасылайце адрасы і грошы за газету. Кошт на месяц — 6 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газету **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) **Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага пераказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**


# Дзякуй падпісчыкам

Адзе Р. з Шаркоўшчынскага раёна.
М.Н. з Мінскага раёна.
Уладзіміру М. з Гомельскага раёна.
Андрэю Н., М.Б. з Полацка.
Антону Т. са Смалявіцкага раёна.
Міхаілу М. са Стаўбцоўскага раёна.
Уладзіміру С., В.Б., Анатолю Л. з Гомеля.
Міхаілу Ш. з Брэста.
Алегу Р. з Полацкага раёна.
Ж.П. з Віцебска.
Паўлу С. з Горацкага раёна.
В.В., Н.Б., Г.Л., Генадзю К. з Гродна.
В.В. са Стаўбцоўскага раёна.
В.А. з Магілёва.
Аляксандру П. са Жлобінскага раёна.
Аляксандру Р., А.К., Таццяне М. з Баранавіцкага раёна.
Уладзіміру Д. з Барысаўскага раёна.

# Мядзведзеў запрасіў журналістаў незалежных СМІ Беларусі

Сустрэча прэзідэнта Расіі з беларускімі журналістамі адбудзецца 23 лістапада.

У ліку удзельнікаў будуць газеты «Наша Ніва» і «Народная воля», агенцтва БелаПАН, партал tut.by. Запрошаныя ў сталіцу Расіі і найбольшыя дзяржаўныя выданні і тэлеканалы, у тым ліку беларускамоўная «Звязда», якую ў лукашэнкаўскі топ-пул не дапускаюць.

Што і гаварыць, рэдактар «НН» быў агаломшаны, калі пачуў у слухаўцы: «Вам тэлефануюць з аддзела грамадскіх сувязяў Адміністрацыі прэзідэнта Мядзведзева...». «НН» ніколі не запрашалі на інтэрв'ю Аляксандра Лукашэнкі.

Можна быць пэўным, што незалежныя газеты падрыхтуюць вострыя пытанні да сустрэчы.

Падыход прэзідэнта Мядзведзева розніца ад падыходу папярэдніх кіраўнікоў Расіі. Нагадаем, Мядзведзеў даў эксклюзіўнае інтэрв'ю нават газеце забітай Ганны Паліткоўскай. Што да Беларусі, дык сустрэча ў Крамлі будзе сігналам Лукашэнку. Яго, гаворачы па-простаму, «бяруць на понт», шантажуюць. Зіма абяцае быць, як заўжды, напружанай у адносінах Беларусі і Расіі. Масква абавязкова зрэагуе на сумневы Беларусі ў падпісанні выгаднага для Расіі, але нявыгаднага для Беларусі Мытнага саюза.

У той жа час запрашэнне незалежных СМІ Беларусі ў Крэмль — важнае прызнанне ролі грамадзянскай супольнасці краіны.

**Мікола Бугай**

# Прафесар Алееў пра армян

Падчас наведвання Мінска прэзідэнт Азербайджану стаў ганаровым прафесарам БДУ.


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Зала рэктарата, дзе адбываюцца пасяджэнні Вучонай рады, разлічаная на 120 чалавек. Там сабраліся азербайджанскія студэнты ў бліскучых касцюмах, нашы студэнты з факультэта міжнародных адносінаў. Усе вокны былі старанна зачыненыя ці зашморгнутыя фіранкамі.

Доктар палітычных навук Ільхам Алееў зайшоў у залу ў суправаджэнні рэктара БДУ Сяргея Абламейкі і міністра адукацыі Аляксандра Радзькова.

Сяргей Абламейка паведаміў, што 30 кастрычніка было вырашана надаць сп.Алееву званне ганаровага прафесара БДУ. Аўдыторыя адрэагавала бурнымі працяглымі апладысментамі. Лідэру Азербайджана ўручылі мантыю і дыплом, пасля чаго прапанавалі слова.

Алееў пачаў з таго, што за апошнія гады адносіны паміж Беларуссю і Азербайджанам дасягнулі вялікага поспеху. Прэзідэнт таксама зазначыў, што за апошні час ягоная краіна прайшла шлях мадэрнізацыі: «Цяпер Азербайджан — самадастатковая краіна. Адна з нямногіх, дзе і цяпер працягваецца эканамічны рост».

Значная частка прамовы Алеева была прысвечаная канфлікту Азербайджана і Арменіі ў Нагорным Карабаху. «Гэты канфлікт быў нам навязаны. Сепаратысцкія тэндэнцыі пры дапамозе армян прывялі да вайны, да этнічных чыстак азербайджанцаў. Больш за мільён маіх суайчыннікаў былі вымушаныя пакінуць свае дамы. Каля 20% азербайджанскай тэрыторыі зараз акупаваныя. Там разбурана ўсё: нашы школы, бальніцы, могілкі, мячэці. Мы прэтэндуем толькі на аднаўленне справядлівасці. Мы перакананыя, што мірнае вырашэнне канфлікту — гэта пытанне часу», — сказаў Ільхам Алееў.

**Зміцер Панкавец**

## Санкцыі супраць лукашэнкаўцаў працягнулі на год

І адразу замарозілі.

Рада міністраў Еўрасаюза 17 лістапада пастанавіла, што візавыя санкцыі супраць беларускіх чыноўнікаў будуць падоўжаныя яшчэ на год. Разам з тым, гэтыя абмежаванні замарожаныя да кастрычніка 2010 г.

Адзначаецца, што ў Беларусі за апошні год назіраецца «адсутнасць трывалага прагрэсу ў галінах, акрэсленых у рашэннях 2008 года». Таму Рада не можа скасаваць санкцыі цалкам. Рашэнне ж аб замарожванні санкцыяў прынятае з мэтай «схіліць беларускія ўлады да прагрэсу ў галіне дэмакратыі і правоў чалавека».

Сярод адмоўных прыкладаў дзейнняў улады былі названыя разгоны акцый апазіцыі, адмовы ў рэгістрацыі партый, арганізацый, газет, нежаданне ўвесці ў краіне мараторый на смяротнае пакаранне.

У сваёй пастанове Рада прапануе Мінску пачаць перамовы аб спрашчэнні візавага рэжыму між ЕС і Беларуссю ды згадвае пра магчымасць у перспектыве перамоваў аб заключэнні двухбаковай дамовы аб партнёрстве і супрацоўніцтве.

Еўрасаюз заклікае Беларусь прывесці выбарчае заканадаўства ў адпаведнасць з міжнароднымі стандартамі, а таксама забяспечыць свабоду сходаў і выказванняў. У такім выпадку санкцыі могуць быць адмененыя поўнасцю.

Напэўна, адным з вырашальных момантаў будзе правядзенне ў красавіку 2010 года мясцовых выбараў. Ад іх дэмакратычнасці і будуць залежаць далейшыя дзеянні Брусэля.

Санкцыі не замарожаныя толькі супраць пяці чыноўнікаў. Сярод іх чацвёра падазраваных у знікненні апанентаў улады — Віктар Шэйман, Уладзімір Навумаў, Юры Сівакоў і Дзмітры Паўлічэнка. Пятая ў гэтай мілай кампаніі — старшыня Цэнтрвыбаркама Лідзія Ярмошына.

А вось Лукашэнка, Пяткевіч і Зімоўскі могуць да кастрычніка беспярашкодна ездзіць у Еўрасаюз.

**ЗП**

## СЦІСЛА

### Козік заступіцца за Малады фронт

Старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Леанід Козік паабяцаў заступіцца за актывістку «МФ» Таццяну Шапуцьку, калі яе выключаць з юрфака БДУ. І нават арганізаваць мітынг у яе падтрымку. Шапуцька і Козік 16—17 лістапада ўдзельнічалі ў Форуме «Усходняга партнёрства» ў Брусэлі.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

### Ціха, мірна + феерверк

16 лістапада на Кастрычніцкай плошчы Мінска прайшла штомесячная акцыя салідарнасці з сем'ямі зніклых і палітвязнямі. Упершыню сёлета ланцуг неабыякавых людзей з партрэтамі не разагналі. На акцыю прыйшло сорак чалавек. Перад яе пачаткам нехта запусціў у неба феерверк.

### Дэпутаты паехалі на Каўказ

17 лістапада пачаўся візіт дэлегацыі лукашэнкаўцаў у Грузію, Абхазію і Паўднёвую Асецію. Мэта — «атрыманне дадатковай інфармацыі аб пытанні прызнання незалежнасці Абхазіі і Паўднёвай Асеціі».

**ЗП**

## Баршчэўскі: Адміністрацыя Абамы будзе працягваць палітыку Буша адносна Беларусі

Палітыкі з Партыі БНФ Лявон Баршчэўскі і Вінцук Вячорка вярнуліся з ЗША, дзе мелі шэраг сустрэчаў у Дзяржэдэпартаменце.

**«Наша Ніва»: Ці задаволеныя візітам?**

**Лявон Баршчэўскі:** Я б сказаў, што ён прайшоў вышэй маіх чаканняў. Калі дэмакратычныя палітыкі, якія перанялі ўладу ў Белым доме, кажуць, што ў палітыцы да Беларусі будуць трымацца бушаўскіх падыходаў, для Амерыкі гэта нечакана.

**«НН»: З кім мелі сустрэчы?**

**ЛБ:** У Дзяржэдэпартаменце бачыліся з чыноўнікамі, якія займаюцца нашым рэгіёнам. Найперш гэта Дан Расэл, які змяніў Дэвіда Крэмера на пасадзе памочніка дзяржсакратара. З Крэмерам, дарэчы, таксама сустракаліся. Уразіла, што ён не кінуў сваю цікавасць да Беларусі. Яму не трэба было нічога тлумачыць. Ён толькі пытаўся, як бачым далейшае развіццё падзей. Наш галоўны пасыл быў такі: мы хочам, каб Штаты і Еўропа мелі скаардынаваную пазіцыю па Беларусі, але на больш прынцыповай пазіцыі.

**«НН»: Ці ёсць у адміністрацыі Абамы зацікаўленасць да беларускага пытання?**

**ЛБ:** У тых людзей, з якімі мы сустракаліся, зацікаўленасць была каласальная. Яны менш за папярэднікаў арыентуюцца ў раскладзе сіл у дэмакратычным блоку. Але зацікаўленыя ў тым, каб дэмакраты ў Беларусі ўяўлялі адзіны фронт перамен. Ідэя нейкіх правых, левых, зялёных блокаў імі не ўспрымаецца.

**«НН»: Ці можна звязваць візіт у Вашынгтон з Вашым намерам удзельнічаць у прэзідэнцкіх выбарах?**

**ЛБ:** Наўпрост не. Наша задача найперш была асветніцкая — паглядзець на новую адміністрацыю, расказаць аб сітуацыі ў Беларусі. Хаця, безумоўна, пытанне аб выбарах узнімалася. З вялікім энтузіязмам успрымаліся словы, што мы будзем імкнуцца выйсці на адзінага кандыдата.

**Гутарыў ЗП**

## Інтэграцыйныя клятвы забытыя

Працяг са старонкі 1.

Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што « мы дыверсіфікавалі свой экспарт, імпарт, гандлюем з Еўрапейскім Саюзам, іншымі». «Ці зможам мы кампенсаваць страчаную выгаду ад супрацоўніцтва з трэцімі краінамі, удзельнічаючы ў Мытным саюзе, сфармаваным пераважна на расійскіх умовах?» — спытаў Лукашэнка. Па ягоных словах, «нельга забываць, што ўдзел Беларусі ў Мытным саюзе набывае геапалітычны сэнс, прытым глыбокі».

За чатыры дні да нарады ў Адміністрацыі прэзідэнта Асацыяцыя еўрапейскіх прадпрымальнікаў (Businesseurope) накіравала ліст на імя еўракамісара па гандлю Кэтрын Эштан з просьбай давесці да расійскага боку занепакоенасць у сувязі са стварэннем Мытнага саюза Беларусі, Расіі і Казахстана. «Гэта пагоршыць умовы доступу еўрапейскіх экспарцёраў на рынкі гэтых краін, а таксама нанясе страту шэрагу еўрапейскіх галін, уключна з машынабудаваннем, сталеліцейнай вытворчасцю, вытворчасцю машыннага абсталявання і харчовых прадуктаў», — гаворыцца ў лісце.

Ідэя Мытнага саюза нарадзілася ў рамках Еўразійскай эканамічнай супольнасці. Яе актыўна лабіраваў Пуцін. Мытны саюз склалі Беларусь, Расія і Казахстан. Таксама гэтая тройка разам мае намер разам уступіць у Сусветную гандлёвую арганізацыю.

Адзіны мытны кодэкс Беларусі, Казахстана і Расіі планавалася падпісаць 27 лістапада ў Мінску. Пасля падпісання, з 1 студзеня, на тэрыторыі Беларусі, Расіі і Казахстана мае ўступіць у сілу адзіны мытны тарыф, а з 1 ліпеня 2010 года — Мытны кодэкс у поўнай меры.

Для Беларусі падпісанне дамовы азначала б істотны рост тарыфаў на ўвоз заходніх аўтамабіляў. Але гэта паўбяды. Удзел у Мытным саюзе намоцна прывязаў бы Беларусь да Расіі.

Калі Беларусь замарозіць пагадненні па Мытным саюзе, гэта можна будзе разглядаць як выбар інтэграцыі ў Еўрасаюз у якасці стратэгічнай мэты.

**ЗП, цытаты БЕЛТА**

# Панаехала гасцей

**Госці Беларускага інвестыцыйна-эканамічнага форуму рассыпаліся ў кампліментах «самай адкрытай эканоміцы ў СНД».**

Праз год мерапрыемства вярнулася ў Мінск. Леташні выезд у Лондан, насуперак чаканням ўрада, не ператварыўся ў нашэсце заходніх грошай на Беларусь. Некалькі пагадненняў аб намерах, і не больш за тое. Цяпер інвестараў вырашылі прывучаць да Беларусі. Не мы ляцелі ў Лондан, а да нас з Лондана.

Гасцей форуму сустракалі макеты найбуйнейшых праектаў — АЭС, «Мінск-сіці», «Маяк Мінска». Грошы на іх ужо знайшлі, а вось на астатнія 100 прапанаваў, якія былі прадстаўленыя на форуме, — пакуль не. Зрэшты, для таго і праводзіўся форум — каб набраць ад замежнікаў абяцанняў. Не проста так у 2010 годзе Беларусь запланавала атрымаць $6,8 мільярда інвестыцый.

### Спачатку грошы, а крэслы — пасля

Нацыянальная бібліятэка прымала гасцей у меру сваіх магчымасцяў. 680 чалавек — такая колькасць дэлегатаў была агучана арганізатарамі — фізічна не маглі змясціцца ў зале. Праз недахоп крэслаў уступнае слова прэм'ера Сідорскага замежныя госці слухалі стоячы.

Лукашэнка аказаўся заняты сустрэчай з прэзідэнтам Азербайджана Аліевым, таму цяжар адказнасці лёг на плечы Сідорскага.

Прэм'ер-міністр расказваў пра эканамічнае становішча Беларусі, акцэнтуючы ўвагу на прывабнай для інвестараў інфармацыі: «У 2009 годзе ВУП Беларусі не паменшыцца ў параўнанні з мінулым годам. Нават у складаных умовах мы мадэрнізуем нашу эканоміку».

Калі першыя выступленні беларускіх чыноўнікаў выклікалі ажыятаж, то далей цікавасць дэлегатаў перамясцілася ў міністэрствы і ведамствы. Зала імкліва пусцела, а на другі дзень форуму прыйшоў добра калі кожны трэці дэлегат.

### Як патрапіць у топ

Галоўная тэма форуму выглядала пытаннем: «Беларусь: уваходжанне ў трыццатку лепшых краінаў па ўмовах вядзення бізнэсу. Рэальна?»

Замежныя госці ахвотна дзяліліся парадамі і ўказвалі на недахопы беларускай эканамічнай сістэмы. Праўда, у адрозненне ад Мінскага форуму, які прайшоў тыдзень таму, крытычныя стрэлы былі не вострыя, а хутчэй сяброўскія. Госці рассыпаліся ў кампліментах «самай адкрытай эканоміцы ў СНД».

Зрэшты, і беларускі бок рабіў выгляд, што ўважліва прыслухоўваецца да крытыкі. Намеснік міністра эканомікі Андрэй Тур пацвердзіў, што з 2010 года будзе зменшаная колькасць падаткаў, а пералік ліцэнзаваных відаў дзейнасці скароціцца да 35 пазіцый.

### Бельгійскі мільярд

Як сімвал пераемнасці лонданскай і мінскай сустрэч урачыста была заключана дамова ўрада Беларусі з бельгійскай кампаніяй AOI n.v. Здзелка ўпершыню абмяркоўвалася год таму на Беларускім інвестыцыйным форуме ў Лондане. Бельгійцы збіраюцца будаваць у сталіцы транспартна-лагістычны цэнтр у раёне нацыянальнага аэрапорта «Мінск».

На хвалі поспеху беларускія чыноўнікі расказалі пра інтарэс расійскіх «Лукойла» і «Раснафты» да прыватызацыі ААТ «Нафтан» і пра зацікаўленасць у айчынным рынку кампаніі Danone.

### Прадалі, як хацелі

Чыноўнікі паспелі абмеркаваць усе істотныя і неістотныя падзеі ў беларускай эканоміцы. Сідорскі пацвердзіў, што «БПС-Банк» удалося прадаць расійскаму «Сбербанку» па выстаўленым кошце. Па меркаванні экспертаў, гэта $500 мільёнаў. Прэм'ер падкрэсліў, што цяпер уласнаручна шукае пакупнікоў для другога банка,«Белінвестбанка».

Віцэ-прэм'ер Андрэй Кабякоў выказаў сумнеў наконт другой крэдытнай праграмы Міжнароднага валютнага фонду: «Ёсць перадумовы, што замежны наш гандаль ажыве».

«У наступным годзе Беларусь можа выйсці на рынак еўраабліграцый», — заўважыў міністр фінансаў Андрэй Харкавец. Каментуючы яго выказванне, Кабякоў выказаў меркаванне, што размяшчаць еўраабліграцыі на суму менш за 250—300 мільёнаў еўра нематэзгодна.

Плён ад найбуйнейшай эканамічнай падзеі года — як назвалі форум дзяржаўныя СМІ — будзе бачны праз месяцы ці гады. Прычым сказаць канкрэтна, дзякуючы якой сустрэчы заключаная тая ці іншая дамова, немагчыма. Урад, зменшыўшы апетыты з Лондана да Мінска, працягвае мэтанакіравана прыручаць інвестараў.

**Ягор Марціновіч**




**Кожны мог зазірнуць углыбкі АЭС.**

**ТОП-5 самых дарагіх інвестыцыйных задумак:**

1) **Вугальная электрастанцыя каля Зэльвы** — $2,1 мільярда. Акупіцца праз 12 гадоў.

2) **Комлекс гідракрэкінгу цяжкіх нафтавых рэшткаў на Мазырскім нафтаперапрацоўчым заводзе** — $894 мільёны. Акупіцца праз 9 гадоў.

3) **Парк адпачынку тыпу «Дыснэйлэнд» у Лагойскім раёне** — $740 мільёнаў.

4) **Новы энергаблок Бярозаўскай ГРЭС** — $490 мільёнаў. Акупіцца праз 15 гадоў.

5) **Сітніцкі горна-ўзбагачальны завод** — $381 мільён. Акупіцца праз 9–12 гадоў.

**ТОП-5 самых цікавых інвестыцыйных праектаў**

1) **Мадэрнізацыя музея Марка Шагала ў Віцебску.** Інвестару трэба будзе ўзнавіць гістарычную адна- і двухпавярховую забудову на Пакроўскай вуліцы, пабудаваць міні-гатэлі, рэстараны, сувенірныя крамы і зрабіць капітальны рамонт музея. Праект каштуе 2,5 мільёна, якія павінны акупіцца праз 10 гадоў.

2) **Музей піва ў Гродне.** Каля самага Нёмана ўзвядуць гасцінічна-забаўляльны комплекс, а ў музеі піва будуць варыць сам хмельны напой. Укладзеныя $11,1 мільёна акупяцца праз 5 гадоў.

3) **Завод па вытворчасці легкавых аўтамабіляў у Лідзе.** Няўжо, апроч лідскіх кедаў, з'явяцца лідскія машыны? Калі знойдуцца $40 мільёнаў, то будуць выпускацца 20–30 тысяч аўтамабіляў штогод. Праект акупіцца за 4 гады.

4) **Плывучыя гасцініцы ў Заслаўі.** Адна з частак праекта рэканструкцыі вяслярнага канала — будаўніцтва беларускай Венецыі.

5) **Свабодная эканамічная зона «Гомель-Ратон»** радуе адразу некалькімі цікавымі праектамі. У Беларусі хочуць выпускаць папяровы аднаразовы посуд ($1,6 мільёна), CD- і DVD-дыскі ($6,6 мільёна), жаночыя гігенічныя тампоны і пракладкі ($4 і 3,1 мільёна адпаведна) і дзіцячыя памперсы ($4,5 мільёна).

## Падатковая пачынае масавую праверку асобаў, якія атрымліваюць заробак, меншы за два пражытковыя мінімумы

Пра гэта паведаміў намеснік міністра па падатках і зборах Васіль Камянко.

Паводле звестак Міністэрства па падатках і зборах, каля 30% прыватных кампаній сталіцы плацяць заробак, ніжэйшы за два бюджэты пражытковага мінімуму (адзін БПМ на сёння складае 250 тыс.). Намеснік міністра пэўны, што ў такіх выпадках асноўны заробак плаціцца нелегальна, у «канвертах».

Такім чынам фірмы сыходзяць ад падаткаў. У фонд сацыяльнай абароны ў Беларусі адлічваецца аж 35% ад фонду зарплаты.

Падаткавікі распачалі вялікую кампанію аналізу даходаў і расходаў супрацоўнікаў такіх фірмаў. Калі расходы перавышаюць заробкі, дык за розніцу спаганяюць падатак і налічваюць штрафы.

Сумы спагнанняў пакуль невялікія. У 2008 годзе тыя, хто не змог патлумачыць перавышэнне выдаткаў над прыбыткамі, даплацілі усяго толькі 1 мільярд падаходнага падатку. Сёлета рост даналічаных сумаў склаў 70%, амаль да 2 мільярдаў.

На Захадзе кантроль за супадзеннем афіцыйных даходаў з выдаткамі яшчэ стражэйшы. Там падаткавікі злічаюць нават самыя нязначныя выдаткі. На сёння такое ў Беларусі немагчыма, бо зашмат людзей залежаць ад даходаў з базару, зямлі, лесу, якія нерэальна ўлічыць. Аднак па меры росту дабрабыту падатковыя патрабаванні будуць узрастаць і ў нашай краіне.

Каб наймальнікі не сыходзілі ад падаткаў, дзяржава павінна будзе знізіць падатковую нагрузку на заробкі. На сёння прадпрыемства сплачвае ў якасці падаткаў 40% звыш сумы заробку.

**Сяргей Гезгала**

## СЦІСЛА

### Выдаткі Life:) большыя за даходы ў 8 разоў

Турэцкая кампанія Turkcell, якая валодае 80% акцый аператара мабільнай сувязі Life:), апублікавала справаздачу за дзевяць месяцаў года. Выявілася, што даходы кампаніі склалі $8,73 мільёна, а выдаткі — $69,56 мільёна. У трэцім квартале, калі актыўна будавалася сетка 3G, інвестыцыі ў развіццё сеткі склалі $32,67 мільёна.

### Самыя багатыя

Еўрасаюз абышоў ЗША па памерах багацця. 27 краінаў ЕС маюць $32,7 трлн актываў, а ЗША з Канадай — «толькі» 29,3 трлн. Раней амерыканцы трымалі грошай больш за еўрапейцаў.

### Раскіданае гняздо

У ЗША прайшоў аўкцыён, на якім прадаваліся канфіскаваныя рэчы заснавальніка буйнейшай фінансавай піраміды ў гісторыі Амерыкі Бернарда Мэйдафа. Шкода ад яго дзейнасці перавысіла $50 млрд. А вось агульная сума прададзеных рэчаў склала мільён даляраў.

### Нафтапрадуктаправод з Мазыра ў Польшчу

Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод разглядае магчымасць будаўніцтва нафтапрадуктаправода ў Польшчу.

### Інвестыцыі ў «Нафтан» перавысяць $1,3 млрд

Такі праект рэалізуе кіраўніцтва прадпрыемства. Мяркуецца, што 15% ад сумы будуць выдаткаваныя з уласных сродкаў «Нафтана», астатнія 85% складуць крэдыты замежных банкаў. Сярод іх маюць быць чэшскі CSOB і аўстрыйскі Unicredit.

### Машынабудаўніцтва ў правале

У студзені—кастрычніку аб'ём вытворчасці знізіўся ў шасці з дзевяці галінаў прамысловасці. Найбольшае зніжэнне аб'ёму вытворчасці адбылося ў машынабудаванні і металаапрацоўцы — на 27,6%.

**ЯМ**

# Міндароўя прызнала: Таміфлю дапамагае, рэмантадзін — не

Міністэрства аховы здароўя распрацавала метадычны ліст пад назвай «Аб асаблівасцях клінічнага працякання пандэмічнага грыпу A/H1N1 і аказання медычнай дапамогі пацыентам з ВРВІ і грыпам».

Ліст за подпісам першага намміністра аховы здароўя Роберта Часнойця ад 12 лістапада адрасаваны начальнікам упраўленняў аховы здароўя аблвыканкамаў, старшыні Камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама, кіраўнікам арганізацый аховы здароўя ведамаснага і рэспубліканскага падпарадкавання, рэктарам медыцынскіх ВНУ.

Рэкамендацыі пачынаюцца словамі: «У сувязі з наяўным пад'ёмам у рэспубліцы захворванняў пнеўманіяй, яе цяжкім працяканнем і ўскладненнямі, выкліканымі вірусна-бактэрыяльнай флорай (мікст-інфекцыяй), а таксама з улікам інфармацыі, атрыманай ад Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, з дапамогай Інтэрнэта і на аснове атрыманага ў працэсе лячэння пацыентаў з дадзенай паталогіяй вопыту, Міністэрства аховы здароўя накіроўвае метадычны ліст (...)».

Далей у інструкцыі гаворыцца, што вірус пандэмічнага грыпу A/H1N1 адчувальны да вакцыны Таміфлю (азэльтамівіру) і занамівіру. Да рэмантадзіну вірус устойлівы.

Прыгадаем словы міністра Жарко ў часе адмысловага звароту да насельніцтва 3 лістапада пра тое, што айчынны арпетол «дзейнічае не горш, а ў некаторых пазіцыях нават лепш, чым Таміфлю. Казаў тады міністр і пра тое, што «ёсць невялікая праблема з Таміфлю, але ёсць наш «рэмантадзін» айчынны, які ў дастатковай колькасці».

Міністэрства ж нагадвае ў лісце, што эфектыўнасць Таміфлю і занамівіру максімальная ў першыя 48 гадзін хваробы.

### Асаблівасці клінічнага працякання A/H1N1

Інструкцыя падрабязна асвятляе асаблівасці клінічнага працякання пандэмічнага грыпу A/H1N1. Гэта:

— больш частае развіццё такога ўскладнення, як вірусная пнеўманія з развіццём дыхальнай недастатковасці на 5-6 дзень і раней ад з'яўлення першых сімптомаў захворвання,

— развіццё вірусны пнеўманіі ў пацыентаў з лішняй вагой,

— хуткае развіццё рэспіраторнага дыстрэс-сіндрому, якому папярэднічае выразная задышка і моцны кашаль, які дрэнна паддаецца лячэнню, харканне крывёй, а таксама хуткае развіццё поліярганавай недастатковасці.

Яшчэ адной асаблівасцю з'яўляецца развіццё цяжкіх формаў захворвання ў маладых пацыентаў.



МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

вул. Мяснікова, 39, 220048, г. Мінск
р/р 3604900000010 у ААТ «ААБ Беларусбанк»
Код 795. Тэл. 222-65-47, факс 222-46-27
e-mail: mzrb@belcmt.by, minzdrav@mailgov.by

МИНИСТЕРСТВО ЗДРАВООХРАНЕНИЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

ул. Мясникова, 39, 220048, г. Минск
р/с 3604900000010 в ОАО «АСБ Беларусбанк»
Код 795. Тел. 222-65-47, факс 222-46-27
e-mail: mzrb@belcmt.by, minzdrav@mailgov.by

12.11.2009 № 02-2-04/695

На № ____________

Начальникам управлений здравоохранения облисполкомов

Председателю Комитета по здравоохранению Мингорисполкома

Руководителям организаций здравоохранения ведомственного и республиканского подчинения

Ректорам высших медицинских учреждений образования

Об особенностях клинического течения пандемического гриппа A H1N1 и оказании медицинской помощи пациентам с острой респираторной вирусной инфекцией и гриппом

В связи с имеющимся подъемом в республике заболеваемости пневмонией, ее тяжелым течением и осложнениями, вызванными смешанной вирусно-бактериальной флорой (микст-инфекцией), а также с учетом информации, полученной от ВОЗ, посредством Интернета и на основании накопленного опыта в процессе оказания медицинской помощи пациентам с данной патологией, Министерство здравоохранения Республики Беларусь направляет методическое письмо для руководства в работе.

**ЧУВСТВИТЕЛЬНОСТЬ ВИРУСА ГРИППА К ПРОТИВОВИРУСНЫМ ЛЕКАРСТВЕННЫМ СРЕДСТВАМ**

**Вирус пандемического гриппа A H1N1 чувствителен к озельтамивиру (Тамифлю) и занамивиру, резистентен к римантадину.**

Эффективность указанных лекарственных средств максимальна при приеме в первые 48 часов болезни, но у пациентов, госпитализированных по поводу тяжелого осложненного гриппа, они должны назначаться вне зависимости от срока начала заболевания.

### Каму мусяць прызначыць Таміфлю

Сярод тых, каму павінна быць прызначанае лячэнне супрацьвіруснымі сродкамі Таміфлю і занамівір — малодшыя за 5 гадоў дзеці, цяжарныя, пацыенты з цяжкім працяканнем грыпу, пацыенты з атлусценнем.

Метадычны ліст утрымлівае практычныя рэкамендацыі для медыкаў, распрацаваныя з улікам новага вопыту, набытага цягам апошніх дзён. Ён мусіць быць даведзены ўсім зацікаўленым суб'ектам пад роспіс.

**Сямён Печанко**

### Участковы доктар мае Таміфлю

Дарэчы, што да Таміфлю.

Як вядома, Таміфлю можна набыць толькі па рэцэпце, завераным гербавай пячаткай паліклінікі. Некаторыя дактары раяць: як толькі вы заўважылі характэрныя прыкметы грыпу (высокая тэмпература, цяжкі кашаль, насмарк), адразу ж трэба пачынаць прымаць Таміфлю.

Каб атрымаць рэцэпт, хвораму не трэба ісці самому ў паліклініку. Трэба выклікаць «хуткую» або ўчастковага лекара. Апошнія цяпер маюць пры сабе рэцэпты з пячаткай, якія выдаюць пры пацверджанні неабходнасці.

**Сусветная арганізацыя аховы здароўя не рэкамендуе арбідол і арпетол**

«На гэты момант у нас ёсць доказы таго, што інгібітары нейрамінідазы, гэта значыць Таміфлю і падобнае, паказалі сваю эфектыўнасць. Што да арпетолу і арбідолу, то гэта не супрацьвірусныя прэпараты. Гэта імунастымулюючыя прэпараты. Пакуль што ў СААЗ няма доказаў пра іх эфектыўнасць, таксама як няма доказаў іх неэфектыўнасці. Таму мы рэкамендуем толькі тое, што ўжо даказана — Таміфлю».

Сусветная арганізацыя аховы здароўя бясплатна паставіла ў Беларусь больш 60 тысяч упаковак Таміфлю.

**Настасся Шамрэй**

**Малады бацька: У паліклініках пара навесці парадак**

**У НН звярнуўся малады бацька, жыхар сталіцы, які распавёў наступнае. Ягонаму сыну неабходна зрабіць пробу Манту. Але ў іхняй паліклініцы прышчэпкі дзецям робяць у агульным аддзяленні, дзе ўвесь час тоўпяцца чэргі хворых на ВРВІ і грып. Чаму нельга арганізаваць для дзяцей асобнае памяшканне для вакцынацыі, пытае малады чалавек.**

# Цэны на ежу ў розных рэгіёнах Беларусі адрозніваюцца на 50%

Гэта вынік дыктату мясцовых вытворцаў.

Агляд праводзіўся Белстатам па 29 пазіцыях, якія ахопліваюць прадукты харчавання.

Самы дарагі горад, ясна, — Мінск. Максімальныя цэны зафіксаваныя тут па 11 пазіцыях з 29: паўвэнджаныя кілбасы, рыба, смятана, тварог, цукар, мука, рыс, проса, бульба, цыбуля, апельсіны. Але і ў Мінску ёсць два прадукты, таннейшыя ў параўнанні з іншымі рэгіёнамі, — гэта яйкі і сокі.

Нізкая цана ёсць вынікам высокай канкурэнцыі на сталічным рынку. Зрэшты, самыя дарагія яйкі прадаюцца ўжо за МКАД — у Мінскай вобласці. Высокую цану дыктуе мясцовы вытворца, неахвотна пускаючы на рынак канкурэнтаў.

Гэтай прычынай можна растлумачыць і феномен Брэсцкай вобласці, дзе самыя дарагія ў краіне малако, кефір і ёгурт. Тут працуе раскручаны малочны брэнд — «Савушкаў прадукт», які славіцца і высокімі цэнамі.

Экспартная арыентацыя адмоўна адбіваецца на мясцовых цэнах. Масла і сыр найбольш каштуюць у Магілёўскай вобласці, што суседзіць з асноўным экспартным рынкам — Расіяй. Розніца ў цане на масла ў гэтай вобласці і ў Мінскай складае 30%.

### Самы дарагі хлеб ядуць у Брэсце

Рэкардсменам па рэгіянальных цэнавых адхіленнях з'яўляецца... проса. Цана на яго ў



PHOTO.BYMEDIA.NET

Мінску адрозніваецца ад цаны ў Мінскай вобласці на 75%! Мука самая дарагая зноўтакі ў Мінску, а самая танная — у Брэсцкай вобласці. Затое ў Брэсцкай вобласці самы дарагі хлеб! Ён на 32% даражэйшы, чым хлеб у Гомельскай.

Цэнавыя нажніцы на яблыкі складаюць 31%. Самыя дарагія яны ў Мінскай вобласці, а самыя танныя — у Брэсцкай вобласці, бо побач Польшча, якая з'яўляецца асноўным пастаўшчыком яблыкаў у Беларусь.

### Белстат не знайшоў у Магілёўскай вобласці ялавічыны

Звестак па цэнах на ялавічыну па Магілёўскай вобласці зусім няма. Белстат не змог выявіць яе ўradзе ў колькасці, неабходнай, каб палічыць сярэднюю цану.

Можа, менавіта ў Магілёве жывуць самыя актыўныя мясаеды?

### Магілёў апошні па заробках

Калі ссумаваць кошт адзінкі тавару па ўсіх 29 асноўных прадуктах, у сярэднім гэты набор будзе каштаваць 156 032 рублі. Самы дарагі «кошык» ў Мінску — 162 766 рублёў. Гэта адпавядае найвышэйшаму ўзроўню заробкаў у сталіцы. Але другой па дарагоўлі апынулася Магілёўская вобласць (159 733), дзе ў верасні 2009 г. былі найменшыя заробкі.

Самы танны набор прадуктаў на Гомельшчыне — 152 102 рублі. Між тым, у верасні яна займала трэцяе месца паводле ўзроўню заробку, прапусціўшы наперад Мінск і Мінскую вобласць.

Як бачым, пры нажніцах цэнаў на асобныя прадукты ў цэлым цана кошыка розніца нязначна. Цэнавы дыктат мясцовых вытворцаў небяспечны. А вось экспарт часам дапамагае ў зніжэнні цэнаў.

**Паводле «Заўтра тваёй краіны»**

## СЦІСЛА

### Харакіры ў Баранавічах

46-гадовы жыхар Баранавіч прыраўнаваў сваю жонку да 34-гадовага земляка, сеў за руль свайго BMW і паспрабаваў наехаць на суперніка проста каля ягонага дома.

Вось толькі замест меркаванага каханага жонкі тэмпераментны муж збіў ягонага стрыечнага 38-гадовага брата. Усвядоміўшы, што нарабіў, раўнівец, не выходзячы з машыны, нанёс сабе некалькі ўдараў нажом у жывот. «Хуткую» выклікаў «геройпалюбоўнік». Брат з пераломам нагі, а муж каханай — з нажавым раненнем брушыны, трапілі ў бальніцу.

За замах на забойства ў дачыненні да баранавіцкага «Атэла» пракуратура распачала крымінальную справу.

**Паводле Intex-press, Баранавічы**

### Магнітныя праязныя ў метро заменяць на бескантактавыя радыёкарткі

Пра гэта паведаміў агенцтву «Мінск-Навіны» начальнік службы руху Мінскага метрапалітэна Рыгор Якімкоў.

У еўрапейскіх краінах таксама ўжо пераважаюць бескантактавыя. Такія карткі вельмі ўстойлівыя пры працяглым карыстанні. Важна і тое, што яны ашчаджаюць людзям час. З радыёкарткай можна будзе праходзіць праз турнікет, не дастаючы яе з торбы.

**Сяргей Гезгала**

# Кірчук варажыў

**Этна-трыа «Тройца» не збаялася грыпу, як і яго адданыя прыхільнікі. 15 лістапада вялікая зала КЗ «Мінск» была поўная людзей.**


LESNOI_SLON.LIVEJOURNAL.COM

Апошні перад канцэртам тыдзень захоўваў трывожную інтрыгу: ці не адмовіцца ўслед за расійскай папсовай зоркай Валерыяй наша «Тройца» ад выступлення. Кірчук і кампанія, аднак, вірусаў не спужаліся.

Канцэрты «Тройца» заўжды пачынае без затрымак, строга пільнуючыся праграмы. Іван Кірчук любіць нагадваць, што гэта ў рэстаране можна замовіць песню, а ў іх — праграма. Як сапраўдны шаман, чараўнік ад музыкі, цягам усяго выступу Кірчук трымае сваіх слухачоў у стане медытацыі.

Змяняючы кампазіцыю за кампазіцыяй, суправаджаючы іх нетаропкімі і нягучнымі каментарамі, лідэр «Тройцы» заварожвае залу — не дае зусім занурыцца ў медытатыўнае сненне, але і ў скокі не пускае, своечасова робячы перапынак на чарговую паказку. Дапамагае яму ў гэтым асвятленне: па сцэне, сценах, столі, зачараваных тварах гледачоў пераліваюцца колеры — зялёны, жоўты, сіні, памаранчавы, фіялкавы, чырвоны...

Наколькі былая цэкоўская зала непрыстасаваная да рок-канцэртаў, настолькі яна, напоўненая даверху колерамі і гукамі, пасуе для музычна-спірытычных сеансаў «Тройцы».

У нядзелю прагучалі новыя творы калектыва, песні, што не выконваліся раней на жывых канцэртах, а таксама кампазіцыі з апошніх двух альбомаў.

Кірчук не адмовіў сабе парадаваць прыхільнікаў «цяжкай» музыкі, заявіўшы, што песні з апошняй пліткі «Жар-жар» занадта цяжкія, а таму прагучаць у акустычным варыянце. Што ж, можа, калі і пачуем ад «Тройцы» на якім сярэднявечным фэсце колькі музычных эксперыментаў у стылі польскага «Open Folk».

**Сямён Печанко**

# Полька беларуская

**7 лістапада берасцейцы разам з гасцямі з Бельска-Падляскага паказалі на вялікай сцэне інсцэніроўку палескага вяселля. Гледачы захапляліся, як дзеці.**



Цікавасць падагравала і тое, што было яно міжнародным. Маладую з-пад Пінска выдавалі замуж за маладога з Бельска-Падляскага (Польшча). Госці з-за Буга, этнічныя беларусы, здзівілі цудоўным веданнем фальклору нашых продкаў.

Распачалі свята сёстры Лук'яновіч з вёскі Лесніки Драгічынскага раёна. Яны цудоўна выканалі ролю сяброўак маладой. Па традыцыі вечарам перад вяселлем моладзь у вёсках ладзіла так званыя «вяночкі».

Асабліва важна было аздобіць галоўны атрыбут свята — каравай. Не менш значная задача — апрануць нявесту. На Палессі выконвалі гэта на хлебнай дзяжы, падаслаўшы кажух. Такі цікавы абрад паказалі жанчыны з вёскі Сташаны Пінскага раёна.

«Вясельны паязд» — гэта значыць, картэж — з'явіўся на публіцы з чырвоным сцягам. Такая была традыцыя калісь. А галоўная адзнака старадаўняга вяселля — шмат песень і прыпевак.

Асобнае месца на вяселлі займае абдорванне маладых, ці «перапой». Тут важная роля адводзіцца маршалку. Ён не толькі ўносіць каравай, але сочыць за ўсімі дзеяннямі гасцей, каментуе іх. Гэта свайго роду тамада.

Ролю пінскай нявесты добра выканала прадавачка Алена. Жаніх Ясько з Падляшша ў сапраўднасці — Мацей, навучэнец Беларускага ліцэя ў Бельску-Падляскім.

Ідэйны натхняльнік і арганізатар свята — стваральнік Музея Малой Бацькаўшчыны ў Студзіводах (прадмесце Бельска-Падляскага) Дарафей Фіёнік. Удзельнікі навучаюцца ў названым вышэй ліцэі, а ў час канікулаў выязджаюць у экспедыцыі на Палессе — запісваюць песні, жывуць у вёсках. Такім чынам духоўна ўзбагачаюцца, быццам атрымліваюць другое дыханне.

У разгар вяселля сталыя жанчыны з вёскі Сташаны Пінскага раёна паказалі ўнікальны абрад — скокі на лавах. Раней спыняліся толькі тады, калі... дрэва трашчала. Як прызналася загадчыца аддзела традыцыйнай культуры абласнога грамадска-культурнага цэнтра Ларыса Быцко, цалкам выканаць традыцыю перашкодзіла тое, што мэблю ўзялі ў арэнду...

Арганізаванае свята — першая ластаўка цыкла «Рух зямлі». Наступная сустрэча — на Каляды.

...А пад закрутную польку танцы плаўна перайшлі ў фае, дзе яшчэ доўга ігралі музыкі. Ногі самі прасіліся ў скокі...

**Сяргей Мошчык, фота аўтара, «Вечерний Брест»**


HURINEVIC.LIVEJOURNAL.COM

**16 лістапада адзначаўся Міжнародны дзень цярпімасці.**

## СЦІСЛА

### З Заслаўя зробяць Венецыю

Вяслярны канал у Заслаўі рэканструюецца ўжо тры гады. У яго ўкладзена каля 30 мільёнаў даляраў. Міністэрства спорту і турызму спадзяецца прыцягнуць яшчэ 40 мільёнаў даляраў інвестыцый. Замежныя грошы дазволяць перабудаваць гасцінічны комплекс і стварыць плывучыя гатэлі.

### Ліхтары ад самагубстваў

Паводле распараджэння мэрыі японскай сталіцы на станцыях Такійскага метрапалітэна павесілі сінія ліхтары для прадухілення самагубстваў пасажыраў, бо тыя ўсё часцей кідаюцца пад колы цягніка. Мяркуецца, што спецыяльна распрацаваныя сінія ліхтары будуць аказваць супакойваючы эфект на людзей.

### Шпіталізаваны Міхаіл Жванецкі

Артыст вымушаны быў адмяніць гастролі «з прычыны цяжкай хваробы».

**ЯМ**

FREEВОЛЬНАСЦЬ

# Інтэрнэт у нашых ложках

Я даведваюся пра сэксуальную арыентацыю новых знаёмых праз інтэрнэт. Напрыклад, нядаўна так вырашыла сваё пакуты адносна новенькага на моўных курсах. Крок першы — знайсці яго профіль на Фэйсбуку. Крок другі — знайсці ў профілі пункт «Перавагі». Крок трэці — прачытаць у гэтым пункце «мужчыны» і зразумець, што новы знаёмы — гей.

Развод з-за інтэрнэта? Таксама не пытанне для сучаснага чалавека. У Брытаніі днямі з'явілася чарговая нацыянальная гераіня. 61-гадовая Шэрыл Робертс стварыла фальшывы профіль у нэце, каб праверыць «на вашывасць» мужа. Яна напісала, што ёй 14, і пачала з ім перапісвацца. 68-гадовы Дэвід Робертс і не падазраваў, што суразмоўца сядзіць у суседнім пакоі. Пасля таго як ён прапанаваў ёй заняцца сэксам, жанчына патэлефанавала ў паліцыю. Цяпер Дэвід Робертс стаіць на ўліку як патэнцыяльны педафіл, ну а ягоная ўжо былая жонка атрымала лаўры славы і падзяку ад паліцыі. Відавочна, брытанская стрыманасць засталася ў часах Вільгельма IV, а чапурыстыя брытанкі сталі, так бы мовіць, more hot.

Мае знаёмыя таксама карыстаюцца інтэрнэтам у карыслівых мэтах направа і налева. Адна з дапамогай сеткі «Укантакце» знайшла былую дзяўчыну свайго бойфрэнда. Не маючы магчымасці яе «ў



рэале» абмеркаваць з сяброўкамі, яна скінула спасылкі на ейную старонку нам у групавым чаце скайпа. А іншы знаёмы рэгулярна знаходзіць сабе дзяўчат на ноч праз «Аднакласнікі». Зараз не патрабуюць пашпарт — шукаюць профіль і знаходзяць больш карыснную інфармацыю.

З-за сацыяльных сетак у інтэрнэце здараюцца расчараванні, разводы і нават забойствы на глебе рэўнасці. Інтэрнэт увайшоў у нашыя ложкі. Мы сталі яго закладнікамі. Калі раней вы маглі застукаць свайго мужа/жонку з кімсьці ў ложку, зараз існуе вялікая рызыка знайсці інтымную перапіску ў скайпе ці ICQ. Так, дарэчы, і развялася адна з маіх знаёмых пар.

У часы Вільгельма IV, мяркую, было больш інтрыг і загадкавасці. Цяпер усё прасцей.

**Вольга Жарнасек**

# Пацыфіст? У чыгуначныя войскі!

Альтэрнатыўная служба ў Беларусі дазволеная, але немагчымая. Адпаведны закон штогод адкладаюць у доўгую скрыню.



PHOTO.BYMEDIA.NET

23-гадовы Дзмітры Смык гатовы пайсці ў турму, абы не кранаць зброі.

6 лістапада ў Гомелі адбыўся суд над 23-гадовым Дзмітрыем Смыком. Малады чалавек абвінавачваўся ва «ўхіленні ад прызыву на вайсковую службу».

Ён, сведка Еговы, катэгарычна адмаўляецца ісці ў войска — гэта супярэчыць яго прынцыпам.

Медкамісія прызнала Дзмітрыя годным да службы з абмежаваннямі. Улічыўшы светапогляд прызыўніка, ваенкамат прапанаваў яму службу без зброі і інтэнсіўнай баявой падрыхтоўкі. Хлопца размеркавалі ў транспартныя войскі, дзе яму прыйшлося б служыць манцёрам чыгуначных пуцей. Аднак Дзмітрый цвёрда дабіваецца рэалізацыі свайго канстытуцыйнага права на альтэрнатыўную службу. На судзе хлопец абараняў сябе сам. Кажа, што адваката аплаціць не можа, — трэба карміць сям'ю.

Пракурор Ігар Купчын не паверыў у шчырасць прызыўніка: «Што гэта за зручная рэлігія такая? Прыйшла армія — прыйшла рэлігія, сышла армія — шматкроп'е... Не было перадумоваў — сям'я Смыка неверуючая». Але калі б пракурор і паверыў, службы па-за вайсковай часткай гомельскі хлопец не дачакаўся б. Афіцыйная пазіцыя ўлады, агучаная пракурорам: «На дадзены момант паняцця «альтэрнатыўная служба» не існуе. Парадак службы не вызначаны і не можа ўжывацца, інакш гэта будзе самадзейнасць».

Суд прызнаў Дзмітрыя вінаватым. Хлопец мусіць выплаціць штраф 100 базавых велічыняў — гэта 3,5 мільёна рублёў. Але ён і не думае здавацца: «Калі дойдзе да турмы, я сяду, — кажа Дзмітрый Смык. — Але войска як варыянт не разглядаю. Я не магу мець дачыненне да Узброеных сілаў. Справа ў сумленні і прынцыпах».

### У дэпутатаў няма патрэбы

У артыкуле 57 Канстытуцыі запісана: «Абарона Рэспублікі Беларусь — абавязак і святарны доўг грамадзяніна Рэспублікі Беларусь. Парадак праходжання вайсковай службы, падставы і ўмовы вызвалення ад вайсковай службы ці замена яе альтэрнатыўнай вызначаюцца законам». Канстытуцыя была прынятая 15 гадоў таму, а закона пра альтэрнатыўную службу няма дагэтуль. Міністэрства абароны прапануе «кампрамісны» варыянт для пацыфістаў — служыць, але без зброі.

Паводле міністэрскіх падлікаў, колькасць прызыўнікоў, якія не могуць браць зброю па рэлігійных матывах, складае сем-восем чалавек штогод. Звычайна іх накіроўваюць служыць у чыгуначныя войскі.

«Адбываецца падмена паняцця альтэрнатыўнай службы, — абураецца праваабаронца Алена Танкачова. — Тых, хто спрабуе рэалізаваць свае канстытуцыйныя правы, прыцягваюць да крымінальнай адказнасці».

У 2002 годзе палата прадстаўнікоў абмяркоўвала праблему «альтэрнатыўшчыкаў». Тады правам заканадаўчай ініцыятывы скарыстаўся тагачасны дэпутат, цяперашні лідэр аргкамітэта апазіцыйнай Партыі свабоды і прагрэсу Уладзімір Навасяд. Ён накіраваў праект закона «Аб грамадзянскай службе», распрацаваны Рэспубліканскай грамадскай моладзевай арганізацыяй «Грамадзянскі форум», у ведамствы. Чыноўнікі прыйшлі да высновы, што ў стварэнні закона няма «грамадскай патрэбы».

### Санітары і паштальёны

Адукацыйны цэнтр «Пост» спрабуе прыцягнуць увагу да праблем «альтэрнатыўшчыкаў», распачаўшы грамадскую кампанію. «Мы ўступілі ў перапіску з міністэрствамі і патэнцыйнымі працадаўцамі, даслалі больш за 2000 лістоў ва ўсе бальніцы і цэнтры сацыяльнай абароны. Няхай людзі, якія не могуць служыць у арміі, працуюць санітарамі ў бальніцах, паштальёнамі», — расказвае каардынатарка праграмы Яніна Каралевіч-Картэль.

У суседняй Расіі аналагічны закон прынялі ў 2004 годзе. Наплыву ахвотных няма. З таго часу больш за 3000 прызыўнікоў адслужылі альтэрнатыўна — па 20 месяцаў.

Палова іх служыць у бальніцах, дамах для састарэлых. Яшчэ каля 30% працуюць у прамысловасці і на будоўлях.

Цікавая і статыстыка, звязаная з матывацыяй «альтэрнатыўшчыкаў». 80% служыць не дазваляе рэлігія, 15% — пацыфісты. Астатнія — малыя народы Расіі, традыцыі і лад жыцця якіх войска б разбурыла.

Пытанне, колькі людзей захоча служыць альтэрнатыўна, застаецца адкрытым. У Расіі на прапанову адгукнуўся прыблізна 1% прызыўнікоў. У нашай краіне за год у войска прызываецца каля 20 тысяч чалавек. Значыць, у Беларусі каля 200 прызыўнікоў могуць адмаўляцца трымаць зброю штогод.

### Галоўнае — стварыць цяжкасці

Міністр абароны Беларусі Леанід Мальцаў у інтэрв'ю «Інтэрфаксу» падкрэсліваў, што трэба, каб «альтэрнатыўшчык зазнаваў большыя цяжкасці за вайскоўца. Каб чалавек сур'ёзна думаў, ці сапраўды яму нельга браць у рукі зброю». Міністр перакананае, што «абедзвюма рукамі «за» альтэрнатыўную службу — «але патрэбны механізм, як даведацца, пацыфіст ці не».

Кожны лістапад кіраўнік дзяржавы атрымлівае спіс праектаў законаў і абірае, якія з іх будуць разглядацца парламентам налета. Які год запар у «заяўцы» Міністэрства працы фігуруе і закон «Аб альтэрнатыўнай грамадзянскай службе». Дагэтуль яго адкладаюць у доўгую скрыню.

**Ягор Марціновіч**

# Маладую доктарку забіў муж?



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Страшнае злачынства здарылася ў гэтым шэрым пад'ездзе.

Асноўная версія следства ў справе забойства на Несцерава кардынальна змянілася.

Як паведамляла «НН» у №42, доктарку Вольгу Лівянцову забілі ў пад'ездзе свайго дома на вуліцы Несцерава ў Мінску. Вечарам 6 лістапада муж знайшоў яе ў лужыне крыві. Паводле экспертызы, смерць наступіла ад траўмы галавы з пераломам касцей чэрапа. Спачатку меркавалася, што жанчыну забілі сякерай. Цяпер следчыя схіляюцца да таго, што яе з нялюдскай сілай ударылі галавой аб вушак.

Паводле пачатковай версіі следства, Вольгу забілі, каб абрабаваць. Знік яе мабільны тэлефон. Пракуратура Завадскога раёна завяла крымінальную справу. Аднак літаральна праз два дні былі затрыманы падазраваны. Ім аказаўся... муж Вольгі, 31-гадовы мінчук. Следчыя мяркуюць, што скрадзены мабільнік — проста яго спроба падтасаваць факты. Пракуратура не паведамляе падрабязнасцяў, аднак і ў паліклініцы, і ў доме, дзе жыла Вольга, кажуць, што міліцыя зацята шукае сведкаў здарэння.

Суседзі па пад'ездзе ў шоку: «Звычайная была сям'я. А потым такое здарылася... Цяпер вось сустракаем вечарамі адзін аднаго, каб не так страшна было дадому вяртацца».

У Вольгі з мужам засталіся двое дзяцей — чатырох і дзевяці гадоў.

**Настасся Шамрэй**

# Першы музычны стане Першым серыяльным

З 23 лістапада тэлеканал «Першы музычны» абнаўляе канцэпцыю. У ім з'явяцца маладзевыя серыялы ад расійскага канала СТС. Акурат таго, на які перайшоў працаваць беларускі прадзюсэр Ягор Хрусталёў.

«Серыялы даюць бясплатна, а трымаць прадакшн і праграмы — гэта грошы, — наракае былы твар канала Кацця Пытлева. — Распушчаныя ўсе праграмы, ніводнага ўласнага прадукта ў эфіры канала не будзе».

Шмат гадоў яна вяла на Першым музычным навіны музычнай індустрыі «120/80». Раней — па чарзе з Люсяй Лушчык, якая перабралася на АНТ. На канале быў і беларускамоўны хіт-парад «Пяцёрка найлепшых» з Віталём Маліноўскім.

Ад старога вяшчання застанецца інтэрактыўная замова кліпаў, праўда, яна перамясціцца на ноч.

**ЯМ**

# Хочуць скейт-парк замест лядовых палацаў

Беларускія аматары экстрэмальных відаў спорту мараць пра свой скейт-парк. Цяпер моладзь трэніруецца проста на вуліцах горада. Яны псуюць гранітныя пакрыцці, дый рызыкуюць сваім жыццём. Напрыклад, любы каменьчык пад коламі ролікаў можа стаца прычынай траўмы.

У суседніх краінах існуюць спецыяльныя паркі для экстрэмальных відаў спорту, дзе можна ў адмысловых умовах развіваць свае майстэрства. У Беларусі такой пляцоўкі пакуль што няма.

Менавіта з гэтай прычыны юнакі праз інтэрнэт-сайт park.bmx.by распаўсюджваюць петыцыю з заклікам да будаўніцтва першага скейт-парка.

**НШ**

# Карупцыя па-беларуску

**З 93 кватэр 40 дасталіся супрацоўнікам Міністэрства аховы здароўя, і толькі астатнія 53 — медработнікам.**

У рэдакцыю «Нашай Нівы» звярнуліся супрацоўнікі Міністэрства аховы здароўя са скаргай на немагчымасць стварыць свой жыллёва-будаўнічы кааператыў (ЖБК).

Супрацоўнікам арганізацый, падначаленых Міністэрству аховы здароўя, у арганізацыі ЖБК адмовіў Мінгарвыканкам. Сярод арганізацый, якія звярталіся з просьбай пра кааператыў, значацца Навукова-даследчы інстытут пульманалогіі і фтызіятрыі, Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр «Маці і дзіця», Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр псіхічнага здароўя, Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр гематалогіі і трансфузіялогіі ды інш. У адказе на іхні зварот намеснік старшыні Мінгарвыканкама Андрэй Ясючэня патлумачыў адмову несправядлівасцю ў Міністэрстве пры размеркаванні жылля, якое будавалася раней.

Аказалася, што ў 2008 годзе Мінгарвыканкам сфармаваў ЖБК №760 для супрацоўнікаў Мінздароўя і падначаленых яму арганізацый. Меркавалася, што ў 152-кватэрным доме №32 у прэстыжным мікраеёне Каменная Горка, які будуецца на захадзе сталіцы, побач з аднайменнай станцыяй метро, 60% кватэраў будуць выдзеленыя для забеспячэння жыллём супрацоўнікаў міністэрства і яго падведамасных арганізацый, 35% — для работнікаў камітэта аховы здароўя Мінгарвыканкама і яго падведамасных арганізацый, яшчэ 5% — для працаўнікоў будаўнічага комплекса.

Праверка галоўнага ўпраўлення па барацьбе з карупцыяй і эканамічнымі злачынствамі МУС выявіла, што з 93 кватэр 40 дасталіся супрацоўнікам Мінздароўя, і толькі астатнія 53 — медработнікам. Пры гэтым у Міністэрстве былі забяспечаныя ўсе, хто стаяў на чарзе.


МІНСКІ ГАРАДСКІ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ
пр. Незалежнасці, 8, 220050, г. Мінск
Тэл./факс (017)2270575, 2276866
Р/р 3604201040016 у філіяле МГД Белінвестбанка г. Мінска, код 764

МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ
пр. Независимости, 8, 220050, г. Минск
Тел./факс (017)2270575, 2276866
Р/с 3604201040016 в филиале МГД Белинвестбанка г. Минска, код 764

08.09.2009 № 01/2-18/4И-4365
На № Б/Н ад 15.06.2009

Министерство здравоохранения
Республики Беларусь

О рассмотрении обращения

В Мингорисполкоме рассмотрено ваше обращения по вопросу организации жилищно-строительного потребительского кооператива для обеспечения жильем работников организаций здравоохранения, подчиненных Министерству здравоохранения Республики Беларусь, нуждающихся в улучшении жилищных условий, в том числе ГУ «Республиканский научно-практический центр гематологии и трансфузиологии», ГУ «Научно-исследовательский институт пульмонологии и фтизиатрии», ГУ «Республиканский научно-практический центр «Мать и дитя», ГУ «Республиканский научно-практический центр психического здоровья» и др., и сообщается следующее.

В соответствии с решением Мингорисполкома от 07.08.2008 № 1848 при Министерстве здравоохранения Республики Беларусь целью строительства 152-квартирного жилого дома № 32 в микрорайоне Каменная Корка-1 сформирован ЖСК № 760, в котором 60% жилья выделено для обеспечения жилыми помещениями сотрудников Министерства и его подведомственных организаций, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, 35% - для работников комитета по здравоохранению Мингорисполкома и его подведомственных организаций, 5% - для работников строительного комплекса.

При этом следует отметить, что по результатам проверки главным управлением по борьбе с коррупцией и экономическими преступлениями Министерства внутренних дел Республики Беларусь было указано на несоблюдение принципа социальной справедливости при распределении квартир в ЖСК № 760 между аппаратом Министерства и подведомственными ему организациями, поскольку 40 квартир распределены работникам аппарата Министерства (были обеспечены все очередники) и остальные 53 квартиры - работникам подведомственных ему организаций.

3685
10092009


На кватэры ў Каменнай Горцы паклалі вока чыноўнікі.

ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

«Улічваючы гэта і вельмі недастатковую колькасць жылля, якое будуецца КУП «УКБ Мінгарвыканкама» для чыргавікоў адміністратыўных раёнаў г.Мінска, якія доўгі час стаяць на ўліку і маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоваў, дастатковых падстаў для арганізацыі ЖБК з мэтай будаўніцтва жылога дома <...> не маецца», —гаворыцца ў адказе намесніка старшыні Мінгарвыканкама.

«У выніку тыя, хто працуе на перадавой — дактары, медсёстры, навуковыя супрацоўнікі, — зноў засталіся з носам! І ўсё гэта ў так званай «сацыяльна справядлівай дзяржаве». Як кажуць, усё для народа!» —напісалі ў сваім лісце ў «НН» абураныя медработнікі.

Іх абурэнне можна зразумець. Цэны жытла на другасным рынку ў Мінску дасягаюць 1400—1500 даляраў за квадратны метр, а тут «чаргавікам» у Міністэрстве яно дастаецца на льготным умовах. Прычым сёй-той, як падазраюць аўтары ліста, атрымлівае другую кватэру запар.

Па тлумачэнні сітуацыі мы звярнуліся непасрэдна да намесніка Мінгарвыканкама Андрэя Ясючэні. Ён адказаў, што адмова ў просьбе аб стварэнні ЖБК групе арганізацый, падведамасных міністэрству, была прамежкавым рашэннем, і цяпер праца прасоўваецца далей. «У нас па 50 зваротаў штодзень. Натуральна, мы не можам задаволіць іх усе», —адзначыў ён.

Наконт пытанняў карупцыі Ясючэня адказаў «НН», што адказ на іх не ўваходзіць у ягоную кампетэнцыю.

Гарвыканкам таксама можна зразумець: яго літаральна бамбардуюць просьбамі пра выдзяленне жытла. І выяўленне сацыяльнай несправядлівасці стала проста добрай падставай для адмовы. У выніку цярпяць звычайныя дактары.

Загана ж — яна нават і не ў дробнай, хай сабе і на сотні тысяч даляраў, несправядлівасці ведамства міністра Жарко. Яна перадусім у заганнай сістэме, калі дзяржава плаціць малыя заробкі, затое трымае працаўнікоў на ланцугу, размяркоўваючы ім жытло на льготных умовах, пуцёўкі і іншыя даброты. Тое самае — у аграгарадках, тое самае, як бачым, — у бальніцах. Такая сістэма патрэбная для палітычнага кантролю, але карумпуе людзей і выклікае зайздрасць і крыватолкі.

Людзям застаецца спадзявацца, што розгалас у незалежных СМІ дапаможа ім дабіцца справядлівасці.

**Вольга Жарнасек,**
**Мікола Бугай**

# Рэктар Медуніверсітэта пратэстуе супраць беззаконня ў сістэме аховы здароўя

**У медыцынскіх колах — скандал. Міністэрства аховы здароўя не працягнула працоўны кантракт з рэктарам Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта.**

Павел Беспальчук мог сысці з пасады ціха, як гэта робяць дзясяткі чыноўнікаў. Але напярэдадні ў газеце «Веснік БДМУ» з'явіўся яго скандальны артыкул.

У артыкуле «У тэрмін да 31 лістапада» гаварылася пра тое, у што пертварылася сістэма размеркавання студэнтаў-медыкаў. Рэктар ахарактарызаваў сітуацыю як «беззаконне», якое дасягнула «свайго апагею».

Як сцвярджае аўтар артыкула, апошнія два гады ўніверсітэцкая камісія была адхілена ад правядзення размеркавання выпускнікоў. Лёсамі маладых спецыялістаў распараджалася Міністэрства аховы здароўя. Даходзіла да абсурду, калі месцы ў найлепшых клініках краіны аддаваліся студэнтам з дрэннымі адзнакамі, а выдатнікі, якія мелі перавагі пры размеркаванні, з'язджалі працаваць у глыбінку і не па той спецыялізацыі, якую вывучалі ва ўніверсітэце на апошніх курсах.

Часам адмацаванне ад размеркавання «ў сувязі з рашэннем міністра» атрымлівалі нават студэнты-мэтавікі.

Павел Беспальчук спрабаваў змяніць сітуацыю і публічна крытыкаваў Міністэрства аховы здароўя за бесцырымоннае ўмяшальніцтва ў працэдуру размеркавання, уздымаў гэтае пытанне на калегіі Міністэрства аховы здароўя. Але спробы дамагчыся справядлівасці толькі дабаўлялі рэктару праблем.

Цяпер зразумела, чаму ў студзені 2008 года аб адстаўцы Беспальчука ў медыцынскіх колах казалі як пра факт, які амаль адбыўся. Сёння дакладна вядома, што ў студзені 2008-га міністр аховы здароўя Васіль Жарко прапаноўваў Паўлу Беспальчуку напісаць заяву аб сыходзе па ўласным жаданні. Але той адмовіўся.

Летам мінулага года ў БДМУ была накіраваная камісія Кантрольна-рэвізійнага ўпраўлення Міністэрства аховы здароўя. Яна працавала больш за месяц, дэталёвай праверцы падвяргалася літаральна кожная паперка. Але нічога супрацьзаконнага ў дзейнасці рэктара і яго падначаленых праваразушчыкі не знайшлі. Здымаць Беспальчука з пасады не было за што.


Рэктар Беспальчук: Месцы ў найлепшых клініках краіны аддаваліся троечнікам, а выдатнікаў засылалі ў глыбінку.

10 лістапада 2009 года скончаўся працоўны кантракт рэктара БДМУ з Міністэрствам аховы здароўя, які быў перазаключаны тры гады таму. Было відавочна, што працягваць яго працадаўца не мае намеру.

Што тычыцца далейшага лёсу рэктара БДМУ, то ў ім пакуль больш яснасці, чым, напрыклад, у прафесійнай кар'еры дырэктара РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі Іосіфа Залуцкага. Будучы 12 гадоў рэктарам, Павел Беспальчук працягваў працаваць на кафедры траўматалогіі і артапедыі БДМУ, база якой размяшчаецца ў Гарадскім цэнтры траўматалогіі і артапедыі 6-й клінічнай бальніцы Мінска. Ён шмат кансультаваў і не пераставаў апераваць.

Павел Беспальчук лічыцца выдатным хірургам у галіне хірургіі кісці рукі.

«Спадзяюся, што з універсітэтам не расстанемся і застануся на кафедры, — сказаў Павел Беспальчук. — Што тычыцца майго звальнення, то каментаваць няма чаго. Кантракт скончыўся, і ўсё... Я ні на што не скарджуся. Ёсць кітайская прымаўка: шчасце — гэта вызваленне ад клопату...»

Цікава, ці будзе рэакцыя на выкрывальніцкі артыкул Паўла Беспальчука з іншых ведамстваў краіны?

**Юрый Лазарэвіч, «Заўтра тваёй краіны»**

# Мілінкевіч гатовы зноў ісці ў прэзідэнты

**«Еўрапейскі форум» сабраў каля тысячы ўдзельнікаў і стаў прэзентацыяй каманды правага кандыдата на прэзідэнцкіх выбарах.**

Форум стаў найбольшым сходам прадстаўнікоў апазіцыі сёлета. Мілінкевічу ўдалося лепш за сваіх канкурэнтаў на месца адзінага кандыдата правесці мабілізацыйную кампанію. Дэлегатамі было вылучана аж 1200 чалавек з усёй краіны. Да Палаца культуры МАЗа 14 лістапада дабраліся не ўсе, але і 810 дэлегатаў сведчыць пра добрую прадстаўнічасць мерапрыемства. Таксама было 100 гасцей, 7 кіраўнікоў дыпламатычных місій (у тым ліку, Швецыі, Францыі, Польшчы, Венгрыі, ЗША, Літвы), больш за паўсотні журналістаў.

Месца на адкрыцці Форуму цяжка было знайсці не тое што ў зале, але нават і на балконе.

У арганізацыйным плане «Еўрапейскі форум» прайшоў выдатна.

Мерапрыемства пачалося з выканання гімна «Магутны Божа». Вёў Форум тэлезорка «Белсата» Павел Мажэйка. Зала была аздобленая сцягамі Беларускай хрысціянскай дэмакратыі, «Маладога фронту», незарэгістраванай Партыі свабоды і прагрэсу, «Правага альянсу», Руху за Свабоду, «Маладой Беларусі». Гэтыя арганізацыі, апроч Партыі свабоды і прагрэсу, сталі ядром Беларускага незалежніцкага блоку.

Адкрыў мерапрыемства намеснік старшыні Руху «За Свабоду» Віктар Карняенка, які досыць самакрытычна зазначыў, што цяпер такімі форумамі нікога не здзівіш. Карняенка задаў пытанне: «Якая мэта форуму?» І сам адказаў: «Стымуляванне дыскусіі, ці патрэбен нам Еўрасаюз і дыялог уладаў з ЕС».

Былі відэазвароты ад уплывовых людзей. Першы — ад былога прэзідэнта Чэхіі Вацлава Гаўла. «Беларусь належыць да краін еўрапейскай дэмакратыі, і мы ў Еўропе будзем чакаць і вітаць Беларусь у ЕС», — зазначыў Гавел.

Таксама да дэлегатаў з экрана звярнуліся былы прэм'ер-міністр Літвы Вітаўтас Ландсбергіс і старшыня Еўрапарламента Ежы Бузак. Па нашай інфармацыі, Бузак таксама вельмі хацеў наведаць Форум, але яму паставілі ўмову, што візу ён атрымае, толькі калі сустрэнецца ў Мінску з дэпутатамі палаты прадстаўнікоў і савета рэспублікі. Бузак адмовіўся. «Еўропа працягвае руку найперш беларускім грамадзянам, а не ўладам», — сказаў у звароце старшыня Еўрапарламента.

Потым ужо слова ўзялі госці Форуму, якія знаходзіліся ў зале. Найдаўжэйшым быў выступ польскага дэпутата Еўрапарламента Яцка Пратасевіча. Ён зазначыў: «Еўропа ніколі не дыктавала беларускім уладам, што ім рабіць, але чакаем, што для Беларусі будзе больш свабоды». Пратасевіч падкрэсліў, што Еўрапарламент будзе працягваць супрацоўнічаць з апазіцыяй і грамадскімі дзеячамі, пакуль у краіне не пройдуць свабодныя выбары.

«Тое, што некалі падавалася кашмарам, пройдзе, а тое, што падавалася салодкай марай, хутка ператворыцца ў рэчаіснасць», — сказаў еўрадэпутат. «Вам патрэбна толькі трохі мужнасці і лідэр, здольны ўзяць на сябе адказнасць», — рэзюмаваў Пратасевіч, які яўна не сачыў за рэгламентам часу.

Дабрацца да Мінска змаглі не ўсе. Адмовілі ў візах былому спецдакладчыку Рады Еўропы па Беларусі кіпрыёту Хрыстасу Пургурыдэсу, а таксама літоўскаму дэпутату Эмануіласу Зінгерысу. Па апошнім выпадку паслу Беларусі ў Літве Уладзіміру Дражыну нават давялося даваць тлумачэнні ў літоўскім МЗС.

Амаль кожны з замежных выступоўцаў падкрэсліваў сваё прыязнае стаўленне да Аляксандра Мілінкевіча.

Старшыня Партыі БНФ Аляксей Янукевіч зрэагаваў на словы Ландсбергіса, што Беларусь — гэта мост між Еўропай і Расіяй. «Ніякі мы не мост, — запярэчыў палітык. — Мост — гэта кепскі варыянт, ён вісіць над прорвай, і па ім усе топчуцца. А Беларусь — паўнавартасны чалец Еўропы».

Лідэр «Маладога фронту» Зміцер Дашкевіч згадаў Кангрэс дэмакратычных сіл, што прайшоў у гэтай зале чатыры з паловай гады таму: «Тады ў зале было багата ўдзельнікаў з сярпом і молатам на грудзях». Гэтым разам сабраліся аднадумцы, а мэтай форуму павінна стаць выпрацоўка стратэгіі перамогі на выбарах», — адзначыў ён.

Ад БХД выступаў Павел Севярынец. Ён зазначыў, што Беларусь разам з іншымі краінамі Цэнтральнай і Усходняй Еўропы — Літвой, Славакіяй, Малдовай — паклікана адрадзіць Еўропу, а «сённяшні рэжым будзе асуджаны Богам і гісторыяй». Таксама Севярынец зазначыў, што будучым прэзідэнтам Беларусі будзе еўрапеец, які любіць Беларусь. Удзельнікі Форуму заўсміхаліся і ўзгадалі, хто ёсць аўтарам кнігі «Люблю Беларусь».

Пасля пачалася праца па секцыях палітыкі, эканомікі і грамадства. Плюсам Форуму было тое, што на яго атрымалася прыцягнуць такіх аўтарытэтных людзей, як палітолаг Віталь Сіліцкі, эканамісты Сяргей Чалы і Аляксандр Чубрык, гісторык Алесь Смалянчук, пісьменнік Уладзімір Арлоў, філосаф Уладзімір Мацкевіч. Зусім не факт, што гэтыя людзі згадзіліся б удзельнічаць у падобным мерапрыемстве, калі б яго ладзілі, скажам, АДС.

Мілінкевіч, які ўвесь Форум прасядзеў у зале і праслухаў усе выступы, слова ўзяў апошнім. Яго праграма і пявінна была стаць ключавой.

«Калі з'явіцца чалавек, якога падтрымае большасць апазіцыі, у якога будзе выдатная праграма і каманда, я стану побач і буду выконваць любую працу, якую мне дадуць. Разам з тым кажу, што я гатовы ісці на выбары, бо маю на гэта сілы і досвед. Я здольны прывесці Беларусь у Еўрасаюз. Я буду рыхтавацца да выбараў», — практычна абвясціў аб пачатку прэзідэнцкай кампаніі Мілінкевіч.

Палітык выступіў як катэгарычны праціўнік байкоту. «Не ўдзельнічаючы ў выбарах, мы пазбаўляем людзей дадатковай інфармацыі. Калі мы не пойдзем на выбары, то ўладзе не трэба нават фальсіфікаваць, тым самым мы легітымізуем уладу».

Мілінкевіч выказаў спадзяванне, што на наступныя выбары апазіцыя пойдзе адзінай калонай пад лозунгамі «Незалежнасць, дэмакратыя, еўрапейскасць».

Форум стаў прэзентацыяй новай палітычнай сілы, якая заяўляе пра свае амбіцыі як у Беларусі, так і за мяжой. Няма сумневаў, што менавіта гэтыя людзі складуць касцяк каманды правага кандыдата на наступных прэзідэнцкіх выбарах. І ўжо амаль ніхто не сумняваецца, хто будзе гэтым кандыдатам.

**Зміцер Панкавец**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Хто не ўвойдзе ў ЕС, застанецца бензінавым шлангам да Еўропы**

«Толькі інтэграцыя Беларусі ў Еўропу здольная забяспечыць паўнавартаснае эканамічнае развіццё, якога мы хочам. І толькі інтэграцыя ў Еўропу здольная гарантаваць бяспеку нашай краіны, — заявіў Аляксандр Мілінкевіч у сваёй прамове на Еўрапейскім Форуме ў Мінску 14 лістапада. — Пераходны перыяд можа быць. Але ў цэлым, калі сцісла: без свабоды і дэмакратыі не будзе еўраінтэграцыі. Без еўраінтэграцыі не будзе дабрабыту і абароненасці. Мы ад ЕС нікуды не дзенемся, маючы яго на трох межах. Проста ці мы будзем побач ЕС, ці ў складзе ЕС. Рэальнасць жорсткая. Хто застанецца за ўсходняй мяжой аб'яднанай Еўропы, застанецца сыравінным дадаткам да Еўрасаюза. Будзе бензінавым шлангам, груба кажучы. Хто будзе сябрам ЕС, будзе, як унутры сучаснай машыны», — такое параўнанне прывёў ён.

**Да сілавікоў: Умацаванне дэмакратыі не азначае аслаблення правапарадку**

«Умацаванне дэмакратыі не азначае аслаблення законнасці і правапарадку, — заявіў А.Мілінкевіч. — Наадварот, правапарадак у еўрапейскіх краінах падтрымліваецца на найвышэйшым узроўні. Афіцэры войскаў, міліцыі і спецслужбаў у еўрапейскіх краінах зарабляюць нашмат больш, чым іх беларускія калегі. І ўпэўненасць, якасць іх жыцця непараўнальная. Расходы на абарону, расходы на дзейнасць структураў аховы парадку ў Беларусі трэба прыводзіць да еўрапейскіх стандартаў. Гэта адзін з ключоў да дэмакратычнай эвалюцыі».

**Пра беларускую салідарнасць**

«Мы абаранялі кожнага, хто пацярпеў у барацьбе, — адзначыў А.Мілінкевіч у прамове на Форуме. — Мы арганізавалі навучанне для рэпрэсаваных студэнтаў. Мы далі дапамогу пацярпелым. Мы ладзілі канцэрты забароненых музыкаў. Запрацавалі «Белсат» і новыя радыёстанцыі. Там, дзе ўлады зачынялі газеты, мы адкрывалі інтэрнэт-сайты. Мы ў меру нашых магчымасцяў дапамагалі кожнай спробе людзей самаарганізавацца. У нас не было на тое вялікіх грошай. Затое была салідарнасць».

Ён таксама адзначыў уласную заслугу ў захаванні арганізаванай апазіцыі аўтарытарнаму рэжыму:

«Мы не дапусцілі развалу і дэзарганізацыі апазіцыі, калі лідэры сыходзілі адразу пасля выбараў ці з'язджалі за мяжу. Я, Мілінкевіч, тут, з вамі. Я прайшоў з вамі ўвесь шлях. З вамі быў на Плошчы ў 2006-м. З вамі сядзеў у турме на Акрэсціна».

Мілінкевіч заклікаў да вытрымкі: «Усё тое, што мы рабілі, мы будзем рабіць да перамогі».

### Пра дыялог Еўрасаюза і Лукашэнкі

У вялікі клопат стане
прыручэнне дыктатуры.
Воўк, запрошаны ў аўчарню,
мусіць быць у авечай скуры.

Камуфляж падобны звыклы —
толькі як схаваеш іклы?

**Кнехт, Мінск**

### Вернемся да прыгону?

**За палітычнымі падзеямі ў Мінску журналісты і чытачы незалежнай прэсы няшмат увагі звяртаюць на тое, што робіцца ў правінцыі.** А там найбольш моцна і яскрава выяўляюцца ўсе дасягненні аўтарытарнай «вертыкалі».

### У Докшыцкім раёне ўсе «дасягненні» навідавоку.

У мястэчку Крулеўшчына, што ў Докшыцкім раёне, спатрэбілася адрамантаваць клуб. Чыноўнікі з райвыканкама ці то не змаглі знайсці сродкаў, ці то не пажадалі напружваць сябе пошукам грошай, а ўзялі ды размеркавалі работы па рамонце паміж... размешчанымі ў Крулеўшчыне падраздзяленнямі Беларускай чыгункі. Нейкая з іх кладзе плітку, нейкая рамантуе дах, а чыгуначным сувязістам загадалі тынкаваць сцены. Вядома ж, за кошт саміх прадпрыемстваў.

Пазалетась гэткім спосабам адрамантавалі Докшыцкую бальніцу — кожнаму прадпрыемству размеркавалі па адной палаце. Дарожнікі і газавікі фарбавалі бальніцу, а ўрачы на суботніках мылі вокны на фермах. Акрамя агульнарэспубліканскіх добраахвотна–прымусовых суботнікаў, на Докшычыне ёсць яшчэ і раённыя. Летась іх правялі аж тры: трэба было сабраць грошы на будаўніцтва басейна. Прайшло ўжо паўтара года, але пра басейн нешта нічога не чуваць.

Як і паўсюль, у Докшыцкім раёне ёсць праблема з працоўнай сілай у сельскай гаспадарцы. Аграгарадкоў набудавалі, а аградомікі нават не ўсюды заселеныя. Знайшлі новы спосаб: у раёне існуе неафіцыйная забарона браць на працу ў будаўнічыя і прамысловыя арганізацыі асобаў, якія звольніліся з сельскагаспадарчага сектара.

Карацей, мясцовыя вертыкальшчыкі набываюць у сваіх раёнах практычна неабмежаваную ўладу. Нібы феадалы ў вотчынных уладаннях. Так і да прыгону недалёка.

**Янка Зуброўскі, Докшыцы**

### Спатыкнуліся на матрацы

Мы, маладая сям'я звычайных студэнтаў, прыйшлі ў Дом мэблі, што на Камароўцы, шукаць двухспальны матрац. Лепей бы мы туды не прыходзілі...

Быў у мяне ў школе сябар — патрыёт Расіі. Бацькі саслалі яго вучыцца з Пецярбурга ў Мёры, дзе я расла. Беларусь сябар паважаў. Вось толькі з абслугоўвання ў крамах кпіў: у вас не беларускае, а бІларускае абслугоўванне. Няправільнае: маруднае, зняважлівае, ігнаруючае правы пакупнікоў.

Арт. 22 Канстытуцыі Беларусі гарантуе кожнаму грамадзяніну краіны роўную абарону правоў і законных інтарэсаў. Дачыненні ў сферы аховы правоў спажыўцоў рэгулююцца Грамадзянскім кодэксам. Існуе закон аб абароне правоў спажыўцоў. Непасрэдным інструментам барацьбы з парушэннямі з'яўляецца кніга водгукаў і прапановаў. Атрымаўшы запіс ў кнігу, прадавец можа страціць прэмію. Меры грашовага пакарання прадаўца прыватнай крамы вызначае яе гаспадар.

Пытанне: як прадаўцы падпарадкоўваюцца вышэйназваным дакументам і ці абараняюць купцы свае правы? Вось вам жыццёвы прыклад.

Мы, маладая сям'я звычайных студэнтаў — кеды, джынсы, заплечнікі, — прыйшлі ў Дом мэблі, што на Камароўцы, шукаць двухспальны матрац. Выбар быў не тое каб вялікі, аднак матрац патрэбнага нам памеру і расфарбоўкі мы знайшлі.

У зале было колькі жанчын з персаналу. Усе яны былі занятыя: размаўлялі па тэлефонах. Падышлі да адной, тая, не перарываючы размову, скіравала нас да іншай. «Іншая» аказалася больш ветлівай, размову спыніла, аднак нічога не пыталася. Хаатычна выпісала талон на аплату перавозкі і буркнула нешта пра тое, што «крама сама ажыццяўляе перавоз набытага тавару на месца прызначэння і нам яго абавязкова прывязуць у хуткім часе».

Паводле закона аб абароне правоў спажыўцоў, спажывец мае правы на поўную інфармацыю пра тавар да моманту заключэння дагавора, а таксама інфармацыю аб тэрмінах дастаўкі тавару.

Вось толькі «хуткі час», паведамілі нам ужо на першым паверсе, — наступны дзень. На нашае пытанне, чаму гэта нідзе не пазначана, адказ быў такі: «Машыны занятыя, вам і так тут сэрвіс, чакайце».

А нам матрац быў трэба сёння. Да заўтра мы чакаць яго не маглі.

Самі выклікалі грузатаксі. Падняліся наверх за матрацам. Доўга чакалі, пакуль прадаўшчыца нешта паясняла парачцы сталых людзей. Дачакаліся: пазяхаючы, яна павяла нас да пакупкі — зусім іншага матраца. На абуранае: «Наш іншы, чырвоны, а не гэты, у ружовыя ружы!» — стомлена запытала: «А вам якая розніца?»

Аплацілі, таксі ўжо ў дарозе, і тут высвятляецца новая акалічнасць: вынесці матрац грузчыкі (што таксама ўваходзіць у сэрвіс крамы) могуць і праз 10 хвілін, і праз 30. На нашу заўвагу, чаму гэтыя асаблівасці нідзе не прапісаныя, прадаўшчыцы пачалі крычаць. Дах паціху ехаў ад ляманту: «А нам какаво! Мы жа тожа ўстаём! Усе тут права сваё качаюць!..»

Калі прыехала таксі, матрац сіратліва стаяў на вуліцы. Пагрузка тавараў у таксі (абавязковая ўмова крамы) таксама адбылася толькі на словах. Добра, што вадзіцель пашкадаваў нас і дапамог. Заадно «супакоіў» — мы не адны такія.

Матрац быў шырокі, машына ледзь яго змясціла. У гэты момант нейкі малады чалавек, хутчэй за ўсё таксама грузчык, высунуўшы галаву з-за дзвярэй склада, зазначыў: «Вазьміце ў прадаўцоў талон, што матрац без дэфектаў. Калі што паламаецца — да нас ніякіх прэтэнзіяў».

Гэта была апошняя кропля. Муж і матрац паехалі дадому, а я пайшла рабіць запіс у кнігу водгукаў і прапановаў. Пахадзіўшы па спасылках — «Вам не сюды, Вам туды», нарэшце апынулася ля акенца, дзе можна ўзяць кнігу.

Як да мяне зляцеліся прадаўшчыцы! З салодкімі посмешкамі маньякаў яны пачалі мяне ўпэўніваць, што па тэлефоне ніхто не размаўляў, усе так і імкнуліся нам дапамагчы, а грузаперавозкі... дык гэта ж не іх аддзел... Чаму не расказалі — дык вы і не пыталіся. А кніга водгукаў і прапановаў у нас адна на ўвесь магазін... яе шукаць зараз трэба — аддзелаў жа шмат...

У той жа дзень набыла пацеркі ў ЦУМе. Пакуль рабіла каралі, пальцы сталі сінімі, а пасля першага кантакту з вадой сінія пацеркі сталі белымі. Фарбы змыліся. З такой жа сітуацыяй сутыкнулася сяброўка, якая прафесійна займаецца дэкаратыўным мастацтвам. Папрасілі ў ЦУМе кнігу водгукаў і прапановаў. Ізноў старая песня — кніга адна на ўвесь універмаг, вы ў нас такія першыя незадаволеныя, кілаграмамі пацеркі прадаем, ніколі скаргаў не было, тавары ў нас найлепшыя. Мы развярнуліся і сышлі. Не распачынаць жа дзеля пацерак вайну з ЦУМам.

А мо трэба?

**Ганна Журавіна, Мінск**




**Не! А што — не? Насценны малюнак у Нацыянальным тэхнічным універсітэце Мінска.**

**ВОДГУК**

### Падазраваны Туровіч не мае адносінаў да «Беларусьфільма», затое быў членам Саюза пісьменнікаў

**Усё ж трэба больш адказна ставіцца да звестак, якія вы атрымліваеце з іншых крыніц.** Маю на ўвазе інфармацыю «Педафілія на «Беларусьфільме»?»

Вы паведамляеце: «Па падазрэнні ў здзяйсненні распусных дзеянняў у дачыненні да непаўналетніх затрыманы рэжысёр кінастудыі «Беларусьфільм» Аляксей Туровіч».

А.Туровіч ніколі не быў рэжысёрам беларускай кінастудыі. Да яе ён мае ўскосныя адносіны: яго асабістыя дадзеныя занесеныя ў картатэку «Беларусьфільма» як артыста масавых эпізодаў, у якіх яго і выкарыстоўвалі. Яго працоўны статус — прадпрымальнік, які на ўласныя (або, можа, атрымавыя ад іншых людзей) грошы імкнецца рабіць кіно з удзелам самога сябе ў галоўнай ролі.

У нейкай ступені яго можна лічыць прадусарам, які запрашае для здымак фільмаў з уласным удзелам прафесійных спецыялістаў — сцэнарыстаў, рэжысёраў, аператараў. Але ўсё гэта рабілася па-за межамі кінастудыі «Беларусьфільм», акрамя, можа, паслуг вытворча-тэхнічнага характару.

У стужцы «Яблык месяца» (2008 г.) ён лічыцца ў якасці рэжысёра, аднак прафесійнай рэжысуры там на пяцьдзесяць хвілін, астатняя гадзіна — кінасамадзейнасць. Дылетантызм прасякае і стужку «Сынок», дзе А.Туровіч таксама пазіцыянуе сябе рэжысёрам.

У кінематаграфічным асяроддзі як творчая асоба ён вагі не мае, хаця сім-тым мінскім і віцебскім артыстам, а таксама некаторым беспрацоўным «кіношнікам» нейкі мінімум даваў зарабляць (праўда, наконт гэтага я чула моцныя эпітэты ў адрас А.Туровіча).

У Саюз кінематаграфістаў яго не прынялі, але прынялі ў Саюз пісьменнікаў Беларусі, уручыўшы на публічнай прэм'еры «Яблыка месяца» пасведчанне за №458 у сакавіку 2009 г. (Спадар Праўдзін, пацікаючы руку новаму чальцу, з натхненнем сказаў: «Наша прозаическая, поэтическая, драматургическая и очеркистская нива плодородит весьма интенсивно».). Было сказана, што ў А.Туровіча надрукаваная кніга.

У А.Туровіча была вялікая прага да славы, і ў імкненні да яе ён ішоў апантана. Здаецца, яна да яго дабіраецца з іншага боку — калі, канешне, суд дакажа тое, у чым падазраюць рэжысёра аматарскага кіно.

**Ала Бабкова, кінакрытык**

### ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

### Мытнёвы саюз і чарадзейны трусік

**Чытачка Т.Шаклач з Мінска** даслала ў Рэдакцыю ліст, дзе прапанавала замест «мытнага саюза» пісаць «мытнёвы саюз», а замест «чароўнага трусіка» — «чарадзейны трусік». Маўляў, расійская «таможня» перакладаецца на беларускую як мытня, а «волшебный» — як чарадзейны.

Аднак моваазнаўца Пётра Садоўскі лічыць, што словазлучэнні «мытны саюз» і «чароўны трусік» цалкам прымальныя. Паводле моваазнаўцы, вызначальную ролю тут адыгрывае традыцыйнасць. У беларускім справаводстве здаўна склалася напісанне «мытны саюз», а да таго, націск у слове мытня не прыпадае на апошні склад. У выпадку з трусікам прымальныя абодва варыянты, лічыць П.Садоўскі.

**Міхаілу Ж-ву з Баранавіч.** Ваш крытычны водгук перадалі пісьменніку Алесю Рыбаку.

«НН» з радасцю друкуе ў газеце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаванні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы не можам пацвярджаць атрыманне Вашых лістоў, не можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Мінск. e-mail: nn@nn.by. Факс: (017) 284-73-29**

**У аэрапорце? У машыне? У метро? Чытай pda.nn.by з мабільніка**

Трымайце руку на пульсе pda.nn.by, дзе б Вы ні былі.

nn.by штодзённа забяспечвае аператыўныя і аб'ектыўныя навіны, ясныя каментары і аналітыку, аўтарскія відэа і фоты. Усім гэтым Вы можаце карыстацца з мабільнага тэлефона. Праз ПДА-версію Вы можаце сачыць за навінамі і каментарамі, ашчаджаючы трафік. Яна зручная і сціслая.

# Хто купіць Гродна з маскоўскім пасольствам?

Прадавец гравюры Браўна і Гогенберга захоўвае інкогніта. Вядома толькі тое, што ён жыве ў Мінску.




На інтэрнэт-аўкцыёне ay.by ад 13 кастрычніка да 12 лістапада выстаўлялася гравюра з выявай Гродна.

Паводле прадаўца, выява ўзятая з другога тома (1575 г.) кнігі «Civitates Orbis Terrarum», выдадзенай Браўнам і Гогенбергам у Кёльне — знакамітага збору больш чым 500 відаў, планаў і праспектаў найважнейшых еўрапейскіх гарадоў.

Выява памерам 485х305 мм з'яўляецца спрошчанай копіяй гравюры Цюнта 1568 г. На гравюры — панарамны від Гродна са сцэнай прыёму маскоўскага пасла на пярэднім плане.

Прадавец сцвярджае, што гэты асобны ліст з кнігі 1575 г. набыты ім у аднаго з нямецкіх аўкцыённых дамоў. Стартавая цана выявы складала 2 мільёны 700 тысяч рублёў, бліц-цана, па якой лот аддаваўся без таргоў, — 2 мільёны 900 тысяч рублёў.

Выклікаюць цікавасць умовы, выстаўленыя прадаўцом. Так, атрымаць гравюру пакупнік можа толькі поштай. Перадача з рук у рукі асабіста выключаная, як і высылка за мяжу. Разлік наяўнымі асабіста з прадаўцом выключаны таксама, як і безнаяўны разлік. Уражанне, што прадавец імкнецца захаваць інкогніта. Вядома толькі тое, што ён знаходзіцца ў Мінску. Сярод іншых лотаў, якія ён прапануе на ay.by, манеты часоў Рэчы Паспалітай.

Гэта ўжо другая гравюра з выявай Гродна часоў эпохі Адраджэння, што выстаўляецца на аўкцыён за апошнія гады. У 2008 г. у Варшаве на аўкцыёне антыкварных прадметаў быў прададзены за $44 000 арыгінал гравюры Цюнта 1568 г. з выявай Гродна.

Той лот быў не па кішэні гродзенскаму гісторыка-археалагічнаму музею, гравюру набыў польскі калекцыянер. Гэтым разам музей не браў удзелу ў таргах. «Мы маем чатыры копіі гравюраў Браўна з выявай нашага горада», — патлумачыў дырэктар музея Юрый Кітурка. Па ягоных словах, прызначаная на аўкцыёне цана гравюры Браўна і Гогенберга — каля тысячы даляраў — не завышаная.

**Сямён Печанко**

## ДЫСКАГРАФІЯ

### Re1ikt




Клиника, Go-Records, 2009

**Праца дарослая, хоць і з падлеткавымі тэкстамі.**

Гэтыя светлагорскія хлопцы нечакана перамаглі сёлета на фестывалі «Бардаўская восень». Сваім альбомам Re1ikt даводзяць, што яны не пустазвоны, якія з аглядкаю лабаюць пад Nirvana, Placebo ці яшчэ каго. «Клиника» — праца самадастатковая і дарослая, хоць і з падлеткавымі тэкстамі.

Галоўная праблема Re1ikt — адсутнасць яркага хіта. У кожнай іх песеньцы можна знайсці цікавыя моманты, але цяжка вылучыць нешта адно.

З удачаў — «Осень теперь здесь» з задушэўным прыпевам, песенька з простай і вытанчанай мелодыяй «Брудная дзяўчына» (гітарны найгрыш вельмі знаёмы, здаецца, у «Лявонаў» такі быў), «Нажы» з вусцішным тэкстам: «Я хачу залезці ў цябе і памерці» і сацыяльна вострая пра светлагорскіх дзетак Light Drugs City.

Re1ikt ідуць слушным шляхам.

### Nevma




Стихия слёз, Go-Records, 2009

**Ці ёсць сэнс цытаваць «Пагоню» Багдановіча?**

Дэбютны альбом ад адной з самых цікавых рок-каманд апошніх гадоў. Вядомая яна перадусім праз вакальныя здольнасці Данілы Забелы. Песні гурту, якія з'яўляліся да выхаду дыска, давалі падставы параўнаць «Неўму» з якім «Мясцовым часам». «Рай побач», «Я не веру» і «Хутка» сфармавалі выразнае ўяўленне пра гурт.

Альбом «Стихия слёз» яго не разбурае, але і не падмацоўвае. Не назавеш гэтую працу шэрай, але надзвычайнай таксама. Можа, праблема ў няроўнасці матэрыялу — прахадныя нумары суседзяць са шматслойнымі шыкоўнымі трэкамі «Дзве ружы» і «Не веру». У некаторых творах адчуваецца штучнасць, як у «Не стаць чужым» (ці ёсць сэнс цытаваць «Пагоню» Багдановіча?). Падгружае мозг і двухмоўная мяшанка. Адчуванне, што ў альбом музыкі сцягнулі ўсе песні, якія мелі. Хай бы ён не быў апошнім у дыскаграфіі гэтага цудоўнага гурту.

### Без білета




Африка, West Records, 2009

**Нібы вясёлыя песні, працятыя трансцэндэнтальным сумам.**

Гурт усур'ёз захапіўся рэгі-тэматыкай (не растылем!). Але, як высвятляецца пры пільным праслухоўванні, усё не так проста. Фронтмэн «Без білета» Віталік — адзін з тых артыстаў, які ўмее пісаць нібы вясёлыя песні, працятыя пры гэтым нейкім трансцэндэнтальным сумам. Невыпадкова ён упадабаў і ўзорную ў гэтым сэнсе песню Black, з якой выйшаў кавер «Странная жизнь».

І даніну павагі музыцы 1980-х ББ тут аддалі напоўніцу. Трэк «Красному диску солнца» — суцэльная цоеўшчына.

Але не толькі настальгіяй па музыцы дваццацігадовай даўніны прасякнуты альбом. Спевы Віталіка асабліва бяруць за душу, калі ён пазбаўляецца нібы абавязковай рэгі-тэматыкі: сведчаннем таму «колдплэеўскі» па атмасферы трэк «Давай останемся» і прыпадабненне да Moby — «По ветру». Не заўжды ў Віталіка выходзіць удалы тэкст, але на тое можна заплюшчыць вочы, калі настрой альбома пасуе да душэўнага рытму.

### Дзмітры Калдун




Колдун, West Records, 2009

**Між тым, што трэба, і тым, чаго хочацца.**

Дэбютнік спевака, які стаў поп-старам на радзіме пасля прызнання ў Маскве. Песні перапоўненыя лірычным нудоцтвам і разбаўленыя нібы суворымі гітарамі, здольнымі абудзіць хіба тую частку аўдыторыі, што гадавалася на праглядзе тэлешоу «Фабрыка зорак».

Выйшаў альбом-кампраміс між тым, што трэба, і тым, чаго хочацца. У кожным трэку адчуваецца пошук гэтай сярэдзіны: каб не пераўзысці межы рокавасці і ў той жа час даць хоць трохі хард-чаду. Ніштавата ўдаліся песенькі «Не рай» і I surrender, што маглі б спакойна распусціцца ў трэк-лісце побач з яскравымі прадстаўнікамі пафаснага поп-рока.

Часам Калдуна схіляе ўжо зусім у настальгічную плынь а-ля «Круіз» («Поезд на юг»), а месцамі праглядаецца любоў да U2 (Somebody's loving you). Але фармат бярэ сваё, чаму сведчаннем дзве апошнія безаблічныя танцавалкі «Настройся на меня» і «Я люблю тебя».

Раскіданы атрымаўся альбом, няцэльны, як складанка розных артыстаў.

**Сяргей Будкін**

## НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

### «Дзеяслоў» №42

Галоўны рэдактар часопіса Барыс Пятровіч зноў бярэ сваіх чытачоў у часавыя вандроўкі.

Гэтак, у нумары можна зазірнуць у кнігі, якія яшчэ не надрукаваныя. Як фантасмагарычны раман Іллі Сіна «Тэатральныя дэманы» пра падводнае падарожжа па затопленым Мінску. Або падарожныя нататкі нямецкага журналіста Увэ Рада пра вандроўку па Нёмане (Калінінград, Літва, Гарадзеншчына).

У дадатак чытачы новага «Дзеяслова» маюць магчымасць вярнуцца ў пачатак 1980-х і пагартаць лісты Анатоля Сыса да сяброў.

І зусім ужо далёка, у Іран, закіне чытача аповесць-рэпартаж «Шахіншах» польскага журналіста і літаратара Рышарда Капусцінскага.

З лёгкага: інтэрв'ю з Уладзімірам Арловым.

**Лявон К**

## СЦІСЛА

### Жорсткае відэа ад J:морс

Гурт J:морс выклаў на сваім сайце відэакліп на песню «Мы станем» з альбома «Аквамарын». Кліп атрымаўся жорсткім: мужчына цягне праз увесь горад скрываўленую дзяўчыну. Здымкі праходзілі ў цэнтры Мінска. У жаночай ролі знялася дачка Уладзіміра Пугача Вольга.

### Бульдозеры ўдалося спыніць

Працы па дэмантажы дома 24-а па вуліцы Рэвалюцыйнай у Мінску спыненыя. Высветлілася, што ўладальнікі не мелі дазволу на знос будынка XIX ст. такім спосабам. Але ўратаваць дом не ўдасца, бо ён 5-й катэгорыі аварыйнасці. Таварыства аховы помнікаў дамагаецца, каб дом дэмантавалі ўручную, а матэрыялы потым выкарысталі падчас аднаўлення.

### Грузінскія паэты на беларускай імпрэзе

У Мінску прайшла прэзентацыя 8-га нумара часопіса «Паміж», прысвечанага дзіцячай тэматыцы. Прэзентацыю сумясцілі з уручэннем сертыфікатаў сёлетнім выпускнікам Беларускага Калегіума. Сюрпрызам стала прысутнасць грузінскіх паэтаў Георгія Нахуцрышвілі і Амірана Свіманішвілі, якія выступілі разам з паэтамі Андрэем Хадановічам і Віталём Рыжковым. Часопіс «Паміж» з'яўляецца праектам выпускнікоў аддзялення філасофіі і літаратуры Беларускага Калегіума.

**КМ, НШ, БелаПАН**

# Рэч Паспалітая і Расія: хто перамог?

Пра кнігу прафесара Камінскага «Рэспубліка супраць Аўтакратыі: Рэч Паспалітая і Расія ў 1686—1697 гадах» піша **Алег Дзярновіч**.

Адметнасць гэтай новай кнігі для рынку гістарычнай літаратуры Беларусі ў тым, што пераклад па-беларуску стаў увогуле першым яе перакладам на іншыя мовы. Праца польска-амерыканскага гісторыка, прафесара Джорджтаўнскага ўніверсітэта Анджэя Сулімы Камінскага выйшла з друку ў 1993 г. у Кембрыджы (штат Масачусэтс) пад назвай «Republic vs. Autocracy». Але пры ўсёй сваёй грунтоўнасці нават у Польшчы, на Радзіме аўтара, спасылак на гэтую кнігу можна сустрэць няшмат. Усё ж такі моўны фактар можа служыць бар'ерам.

У вузкім сэнсе манаграфія прысвечаная разгляду палітыка-дыпламатычных зносін Рэчы Паспалітай і Расіі на працягу даволі сціслага перыяду — ад «Вечнага міру» 1686 г. паміж гэтымі дзяржавамі да абрання ў 1697 г. на трон польска-ліцвінскай дзяржавы караля з саксонскай дынастыі Аўгуста ІІ.

За даследаваннем стаіць грунтоўная архіўная праца. Але не менш цікавы і спосаб, з дапамогаю якога аўтар прапануе зірнуць на рэаліі канца XVII ст. — праз параўнаўчае апісанне парадкаў, нораваў і традыцыяў у дзвюх дзяржавах, так цесна звязаных ваеннай і дыпламатычнай гісторыяй.

### Змена вектараў

За дзесяцігоддзе канца XVII ст., прааналізаванае ў працы, адбыліся радыкальныя змены ў адносінах паміж дзяржавамі — на ўзроўні ментальнага ўспрыняцця. З прыходам да ўлады Пятра І змянілася закладзеная яшчэ Васілём ІІІ мадэль камунікацыі Расіі з Захадам, якая адбывалася праз Рэч Паспалітую.

Пры канцы XVII ст. Рэч Паспалітая ўсё яшчэ заставалася для расіянаў краінай палітычнага прытулку, логавішчам «клятага» лацінізму і ўвасабленнем незразумелай дзяржаўнай мадэлі, якая атаясамлялася расіянамі з вялікалітоўскай алігархіяй.

Акрамя таго, Рэч Паспалітая была сур'ёзным супернікам Маскоўскай дзяржавы ў барацьбе за спадчыну Кіеўскай Русі. А праз усё XVII ст. галоўнымі «еўрапеізатарамі» Масквы былі беларусы ды ўкраінцы — выпускнікі езуіцкіх калегій і праваслаўнай Кіева-Магілянскай акадэміі.

Сярод такіх культуртрэгераў быў і Сімяон Полацкі, які памкнуўся ў Маскву ці то баючыся пераследу з боку ўладаў Рэчы Паспалітай за калабарацыянізм, ці то жадаючы зарабіць сваёй адукацый і ведамі грошай. Стараабрадцы ж працягвалі ратавацца ад расійскай артадоксіі на землях Вялікага Княства Літоўскага яшчэ ўсё XVIII ст.

У канцы XVII ст. паводле волі Пятра дзверы сармацкай культуры польска-ліцвінскай рэспублікі будуць для Расіі раз і назаўсёды зачыненыя. Ад пятроўскага часу «акном» для замежнага гандлю Расіі стане Балтыка.

### Узаемнае неразуменне

Суседзяў абапал Дняпра многае звязвала — і адна, і другая дзяржава цягам XVII стагоддзя перажылі вялікія крызісы: Расія — Час Смуты (1604—1613 гг.), Рэч Паспалітая — Патоп (1654—1660 гг.). Іх выжыванне ў значнай ступені залежала ад здольнасці розных слаёў насельніцтва яднацца, каб процістаяць замежнай пагрозе і абараніць сваю дзяржаву ад знішчэння. Таксама для абедзвюх дзяржаваў казацтва было фактарам унутранай нестабільнасці.

На гэтым аднак, як піша Камінскі, падабенства Расіі і Рэчы Паспалітай заканчваецца. Адрозненні, асабліва ў сферах дзяржаўнага кіравання, наяўнасці і функцыянавання грамадскіх інстытутаў і палітычнай культуры, заставаліся велізарнымі.

У Расіі аўтакратычны цар сімвалізаваў парадак, справядлівасць, выратаванне душаў сваіх падданых і атаясамляўся з дзяржавай як такой. Падмуркам грамадска-палітычнай сістэмы Рэчы Паспалітай былі шляхецкія вольнасці ў спалучэнні з вяршэнствам закона. Калі ў Расіі за кошт паўнамоцтваў Земскага Сабора і ўплыву Праваслаўнай царквы падвышалася ўлада абсалютнага манарха, у Рэчы Паспалітай Сойм і мясцовыя соймікі мелі значныя заканадаўчыя паўнамоцтвы і паспяхова процістаялі спробам узмацніць уладу караля.

У адрозненне ад буйных расійскіх землеўладальнікаў і чыноўнікаў, якія заставаліся царскімі слугамі, шляхта Рэчы Паспалітай і палітыкі пачуваліся свабоднымі грамадзянамі, спадкаемцамі рэспубліканскай спадчыны Рыма.

Палітычны ж лад Рэчы Паспалітай заўжды быў незразумелы расіянам. Сама прырода канстытуцыяналізму выклікала ў іх здзіўленне — як такі вялікі дзяржаўны механізм можа функцыянаваць пры тым, што так шмат людзей выказваюць свае правы на кіраванне ім? Маскоўскім службоўцам такія прынцыпы ўяўляліся анархіяй і праяваю слабасці.

Падобныя погляды з XVII і XVIII ст. пярэйдуць у расійскую гістарыяграфію XIX ст. ды гратэскна замацуюцца ў савецкай гістарыяграфіі. Вось адкуль паходзіць пыхліва-кплівае стаўленне расійскіх гісторыкаў і публіцыстаў да вольнасцяў Рэчы Паспалітай.

Расійскія паслы ў XVII ст. паводле стэрэатыпаў уласнай краіны засцерагаліся кантактаваць з прадстаўнікамі розных фракцый шляхты, а шукалі аўдыенцый толькі ў караля. Але гэта насцярожвала шляхту, якая бачыла ў дыпламатычнай актыўнасці манарха прыкметы ўмацавання каралеўскай улады.



**Камінскі А. С. Рэспубліка супраць Аўтакратыі: Рэч Паспалітая і Расія ў 1686—1697 гадах** / Пер. з англ. А. Мартынаў. — Мінск: Логвінаў, 2009. — 350 с. — (Кнігарня «Наша Ніва»).

У сваю чаргу ў Рэчы Паспалітай Расію ўспрымалі амаль як Персію ці Атаманскую імперыю, то бок дзяржаву з таталітарным, а не дэмакратычным дзяржаўным ладам. Больш за тое, праз свой тыпова заходні светапогляд польска-ліцвінскія палітыкі нават не спрабавалі зразумець логіку дзеяння расійскай тыраніі. Іх расійскія калегі, наадварот, у большай ступені цікавіліся ўнутранымі справамі Рэчы Паспалітай, праўда, застаючыся ў палоне ўласных стэрэатыпаў.

### Суседкі-закладніцы

Камінскі піша, што далучэнне да Маскоўскай дзяржавы Украіны стала першым крокам на шляху да стварэння Расійскай імперыі. Расклад сілаў між Варшавай і Масквой пачаў змяняцца на карысць апошняй, калі эканамічны і чалавечы патэнцыял Рэчы Паспалітай яшчэ быў сувымерны з расійскім. Масква аднак скарысталася сваёй выключнай здольнасцю мабілізаваць людскія рэсурсы. Цару трэба было толькі даць загад — і, нягледзячы на адсутнасць імпэту ў выканаўцаў ды няўмелае кіраванне, у Расіі фармаваліся войскі, ствараліся мануфактуры ды закладаліся гарады.

Аналізуючы прычыны замежнапалітычных няўдач Рэчы Паспалітай, неабходна браць пад увагу палітычную недабачнасць і самападман яе палітычнага саслоўя. Безумоўна, памылкі рабіліся і ў Расіі. Маскоўскія дыпламаты бачылі ворагаў ва ўсіх сваіх суседзях і падазрона ставіліся да любых сяброўскіх прапановаў. У той час як грамадзяне Рэчы Паспалітай хваліліся ад рэчаіснасці за беспадстаўным аптымізмам, маскоўская палітыка грунтавалася на песімістычным бачанні адносінаў паміж дзяржавамі.

Пры канцы XVII ст. у абедзвюх краінах назіралася поўная адсутнасць паразумення паміж палітычным кіраўніцтвам і грамадствам, неабходная для належнага функцыянавання дзяржавы. У Расіі палітычнаму кіраўніцтву бракавала грамадскіх інстытутаў, якія б дапамагалі яму правесці неабходныя рэформы. У Рэчы Паспалітай сацыяльныя інстытуты — тое, што з пазіцый сённяшняга дня можна назваць грамадзянскай супольнасцю — былі такімі моцнымі, што ўраду проста не ставала паўнамоцтваў, каб прасоўваць свае палітычныя ініцыятывы.

Хто выйграў у тым спаборніцтве? Так, у канцы XVII ст. Рэч Паспалітая страціла ініцыятыву, а ў канцы стагоддзя наступнага гэтая дзяржава была бясслаўна падзелена суседзямі. Але ці не сталася пераможная тады Расія вечнай закладніцай уласнай моцы, пабудаванай на аўтарытарнай уладзе і татальнай мабілізацыі? Гэтыя прынцыпы дзяржаўнага кіравання вельмі глыбока ўвайшлі ў палітычнае цела Расіі ды не даюць спакою яе суседзям да сёння. У той час як са спадчыны парламентарызму Рэчы Паспалітай мы можам вынесці тыя гнуткія мадэлі кіравання, якія адпавядаюць прынцыпам сучаснай дзяржавы. Але тут важна атрымаць урокі з гісторыі.

**Анджэй Суліма Камінскі**

Нар. у 1935 у Кракаве, маленства правёў у Навагрудку. Польска-амерыканскі гісторык, прафесар Джорджтаўнскага ўніверсітэта.














ПЫТАЙЦЕСЯ Ў КНІГАРНЯХ І Ў НЕЗАЛЕЖНЫХ РАСПАЎСЮДНІКАЎ

# Быць даяркай

**Віктар Шукеловіч.** Апавяданне.

«Быць даяркай — пачэсная праца», — увесь час чула ад настаўнікаў і праўдзіва лічыла Марыся. Даяркамі былі яе маці, бабуля і нават прабабуля, якую прымусілі пайсці на гэту працу пагрозай раскулачвання.

Марыся не дужа цікавілася раскулачваннем прабабулі. Сам працэс раскулачвання стаяў для яе ў адным шэрагу з «распальцоўваннем» і «расчляненнем». Перад вачыма паўставала карціна: пасярод вёскі стаіць ейная прыгнутая вякамі прабабуля з моцна сціснутымі кулакамі. Кучка камуністаў каля адной і другой рук спрабуюць разагнуць старэчыя пальцы. Карціна дужа смяшыла. Марыся рагатала кладучыся покатам, аж пакуль маці не пачынала біць яе ручніком праз спіну. Тады Марыська падымалася, дзьмухаючы на рану, нанесеную ручніком, і ішла да работы.

У школе Марыська неяк чытала апавяданне пра рукі маці. У мацярок дзяцей з апавядання рукі пахлі ў каго чым: у адной матулі хлебам, бо тая працавала на хлебазаводзе, у другой лекамі, бо тая прадавала медыкаменты ў аптэцы. Колькі памятае Марыська, рукі яе маці пахлі кіслым малаком і кароўскім гноем. Канешне, не самы прыемны пах, але лепшы, чымся бензінавы.

Ужо трэці год запар Марыся сама працавала на кароўскай ферме. Сама даіла, а дакладней насоўвала на кароўскія цыцкі дойныя апараты, карміла, заганяла, выганяла, карацей — даглядала. Ужо і яе рукі пахлі кароўскім малаком і гноем. Але нічога, затое яе вельмі ваніла кіраўніцтва роднага калгаса «Святло Леніна». Дый было за што: каровы ў Марыські заўсёды сытыя, прыгожыя, аж бакі ў іх блішчаць. Зусім не тое, што ў старых даярак.

Гэтыя каляжанкі Марыські былі добра праспіртаваныя, як жабы ў школьным кабінеце біялогіі, алкагалічкі. Ім было не да кароў, а толькі да таго, каб хутчэй памяліцца. Усім было вядома, што каровы ў іх не сыцелі таму, што яны кралі з іх жолабаў зерне і муку. Потым у торбачках выносілі з фермы і бадзяліся па вёсках, прадаючы. Зробленыя ж грошы ператвараліся ў гарэлку і знікалі ў бяздонных горлах. Звольніць даярак было немагчыма, бо ў той маленькай вёсачцы не было больш ахвотных працаваць з каровамі.

Вёска была глухая, населеная старымі, і Марыська прыкметна выдзялялася на старэчым фоне. Маладая, спрытная, яна паспявала ўсюды: і на ферму, і па гаспадарцы, і ў лес у ягады, і ў магазін за сем кіламетраў купіць усёй вёсцы хлеба, і ўсюды. Уся вёска шукала Марысьцы добрага хлопца, каб гарэлкі не піў. Але такога нідзе не было. Тады шукалі хоцьякога, абы хлопца, але і такога не знайшлі, калі не лічыць дзеда Цімоха з хутара Бартэлі — удзельніка трох войнаў, заслужанага калгасніка і ветэрана. Але Марыська сама не хацела за плюшывага і глухога дзеда Цімоха. Доўга яшчэ ў вёсцы перамывалі Марысьцы косткі: «Добрая дзеўка, але фанабэрыстая. Гэта ж падумаць — такога мужа не захацела! А ён жа ж такі работнік, такі ўмелец». Вясковыя ўдовы, у якіх галовы трэсліся ад старасці, цяжка ўздыхалі, памалу згараючы ад чорнай зайздрасці да Марыські.

На першага траўня — Дзень усіх працоўных — на ферму прыехаў старшыня. Тоўсты, чырвоны і потны мужчына з бруднымі валасамі і ў мятым касцюме выдаваў даяркам прэміі. У старых даярак вочы блішчэлі ад прыемных магчымасцяў, якія прыходзілі разам з грашыма. Старшыня пасля ўручэння прэмій доўга корпаўся ў кішэні свайго мятага гарнітура і, нарэшце, пачасаўшы тлустыя валасы, сказаў:

«Гэта... Бабы, ад нашага калгаса едзе ў сталіцу на з'езд працаўнікоў сельскай гаспадаркі — Марыська». Усе дружна запляскалі ў ладкі.

Вечарам даяркі сабраліся «мачыць» прэміі. Паклікалі і Марыську. «Ну, бабы! — пачала кульгавая Вэрця. — Вып'ем за Марыську. Каб ёй добра з'ездзілася ў сталіцу і знайшлося там жаніха». Даяркі зарагаталі. Марыська ж зачырванелася як бурак, але вачэй не апусціла, а ўпэўнена падняла чарку і ледзь не абамлела: у чарцы плавала вялікая і тоўстая мурашка. Марыська зірнула на чаркі іншых: яны былі ўжо пустыя. «Было не было, — падумала яна. — А то яшчэ палічаць, што я заганарылася». Упэўнена яна паднесла чарку да вуснаў, кульнула яе ў горла. Вадкасць пакрысе пацякла ў нутро, а мурашка непрыемна заказытала ў горле, прыклеіўшыся недзе да ўнутраных сценак. Марыська падхапілася як абвараная і пабегла, закрываючы рукой рот, да памыйнай ямы.

Уся наступная раніца для Марыські была напоўненая дзівоснымі пахамі і колерамі, бо яна ехала ў Мінск. Незвычайна пахла поле з няспелай збажынай, малады лясок зачароўваў густой зелянінай. У стракатай, з малюнкам вялікіх півоняў, сукенцы, светлых, незразумелага колеру, чаравічках Марыська, цягнучы збоку ровар, падымалася на Траццякову гару. Уз'язджаць на яе роварам цяжка, таму дзяўчына цягнула яго поруч, поўная надзей і спадзяванняў. Усё ўнутры яе калацілася, прыемны камяк то падступаў да горла, то правальваўся недзе ў жывот.

Салон ранняга прыгараднага цягніка збіваў з ног мешаным пахам потных падпах, нямытых шкарпэтак і перагару. Рабочыя, што жылі ў прыгарадных вёсках, ехалі на працу. Марысьцы ранак па-ранейшаму здаваўся цудоўным. Яна магла, не думаючы, расцалаваць хоць дзядзьку бамжаватага выгляду, што сядзеў у кутку, хоць хударлявую кабету з сухімі губамі, хоць васпаватага падлетка ў парванай кашулі, хоць каго...

Перасеўшы ў электрычку, Марыська заўважыла, што склад пасажыраў змяніўся. Пераважалі дачнікі-пенсіянеры. Былі яшчэ людзі з разумнымі тварамі, але ў беднаватай вопратцы. Дзяўчына заўважыла, што людзі з разумнымі тварамі ўсе нешта чытаюць. Яна таксама не захацела здавацца дурніцай і з торбачкі дастала газету, у якую было ўкручана сала, узятае на абед. Газета была ў тлустых плямах. Літары скакалі перад вачыма. Марыська вырашыла не марнаваць часу, а падсілкавацца. Якраз было недалёка ад Мінска, а там, магчыма, не будзе зручнага моманту.

Толькі Марыська хацела адкусіць ад лусты хлеба з пакладзеным на яе скрылёчкам сала, як заўважыла, што малады хлопец з разумным тварам пільна на яе ўглядаецца. Ком падступіў да горла. Унутры не гарэла, а, наадварот, было свежа, як ад ментолавай жуйкі. Яна спадылба паглядзела на хлопца і кіўнула галавой на свой імправізаваны стол. «Дзякуй вам вялікі! — казаў хлопец з поўным ротам. — Я ад учарашняга абеду папросту нічога не еў. І сёння не паспеў, бо на электрычку спяшаўся». Марысьцы было прыемна за падзяку, за тое, што, па ўсім відаць, вучоны хлопец звяртаецца да яе на «Вы». У вёсцы на Марыську заўсёды толькі тыкалі.

Вельмі хораша так было ехаць у добрай кампаніі. Марыська ўся расслабілася, і дужа ёй стала соладка і прыемна. Да канца жыцця магла ехаць з тым разумным хлопцам, а ён бы ёй усё нешта расказваў і расказваў. Калі малады чалавек пацягнуўся за новым скрылёчкам сала, Марыська захацела яму падаць. Іх рукі на долю секунды спатканіся. Пальцы хлопца незнарок крануліся загарэлага запясця вясковай дзяўчыны. Нібы ток працяў усё яе нутро. Ток гэты ад запясця хвалямі разышоўся па целе і закончыўся недзе на пальцах ног. Марыська апрытомнела, а потым з большай цікавасцю прыгледзелася да хлопца. Вельмі прыйшлася даспадобы Марысьцы ўсмешка: такая шчырая і дабрадушная, што аж дух займала. Вочы ў хлопца былі, што два азярцы з чыстай вадою. А яшчэ дужа Марысьцы падабаўся кірпаты нос, на якім яна налічыла пяць вяснушак. Палічыла з правага боку дзве, і з левага — тры. Марысьцы нават на нейкі момант захацелася пацалаваць хлопца ў нос, а потым яна на сябе за такія думкі разззлавалася і ў галаве настраляла хлопцу пстрычкамі ў нос і шчаўбанамі ў лоб. А пасля так стала Марысьцы шкада гэтага хлопца, такі ён здаўся ёй бездапаможны, не здольны абараніцца ад яе пстрычак, што яна абняла яго ў думках. А ён, не падазраючы, якія дзяўчына перажывала жарсці ў сваёй фантазіі, не пераставаў ёй расказваць пра замкі і палацы, песцячы яе грудзі позіркам. Марыська ніколі не ганарылася сваімі формамі, але зараз знарок выпнула грудную клетку, нібы паправіла каўнерык, прымушаючы хлопца ацаніць яе гожую і далікатную лебядзіную шыю. «А раптам спадабаюся настолькі, што прапануе мне стаць ягонай жонкай, — думала дзяўчына. — А потым у нас будуць такія смешныя дзеці з кірпатымі насамі, а я буду цыраваць яму кашулі, штодня будзем абдымацца, хадзіць узяўшыся за рукі, а ён будзе майстраваць дзецям драўляныя караблікі і расказваць пра цудоўныя замкі і шыкоўныя палацы. Ах! — уздыхала яна. — Усе людзі будуць нам зайздросціць, а шчасце наша будзе большае нават за калгасную кантору».

Але вось ужо паказаліся высокія будынкі і трубы сталіцы. Пасажыры пачалі ціснуцца да выхадаў. Сабралася і Марыська. Хлопец па-джэнтльмэнску ўзяў яе торбачку, каб паднесці да выйсця. Ужо стоячы ў тамбуры, чакаючы, калі расчыняцца дзверы, ён сказаў Марысьці: «Прабачце, панна, але не маглі б вы пакінуць нумар свайго тэлефона?» Слёзы падступілі да Марысьчыных вачэй. Дзяўчына імкліва вырвала торбачку з рук хлопца і саскочыла на перон. Разгублены хлопец толькі ўбачыў, як Марыська што было моцы, згорбіўшы плечы, якія раз-пораз уздрыгвалі, пабегла ў бок вакзала. Усе спадзяванні беднай дзяўчыны з вёскі аказаліся разбітымі аб мур калгаснай фермы. Не, не быць гэтаму хлопцу Марысьчыным мужам, не браць яе за руку, не размаўляць з ёю. «Дурніца! Кампартыя! Даўбешка! — ганіла дзяўчына сябе пад нос. — У Мінску табе жаніх будзе! Раскатала губу, а да быдла, да быдла не хацела? Тпру-у, дарогай! Тпру-у, дарогай!» — праз слёзы ўтаймоўвала Марыся свае мары покрыкам, якім пастухі скіроўвалі кароў да фермы.

«Хіба я што не так сказаў? — не мог зразумець сваёй віны малады спадарожнік Марыські. — Магчыма, я папрасіў залішне вульгарна...» Адкуль адукаванаму маладому чалавеку ў век камп'ютарных тэхналогій ведаць, што Марысьчынага даярскага заробку на тэлефоны не хапае.



PHOTO.BYMEDIA.NET

# Наш чалавек Гары Потэр

**У мастацкай галерэі «Ў» ідзе выстава беларускага поп-арту.**




У нас жа як: у суботу, 7 лістапада, — выходны, дзяржаўнае свята, а ўжо ў нядзелю гандляроў і тарбэшнікаў з «Дынама» труба кліча на капіталістычна-працоўную варту. Таму пытанне, ці ёсць чым пажывіцца ў Беларусі мастаку, які працуе ў кірунку поп- і сац-арту, не ўзнікае.

Галерэя сучаснага мастацтва «Ў» (пр.Незалежнасці, 37а) прэзентуе праект: «Філасофія мас. Беларускі неа-поп арт». Выстаўляюцца такія зубры беларускага сучаснага мастацтва поп-арту: Уладзімір Цэслер, Руслан Вашкевіч, Артур Клінаў і Сяргей Ждановіч.

З пачынальнікам поп-арту Эндзі Уорхалам усё зразумела: для сваіх эксперыментаў ён выкарыстоўваў іконы вядомай яму масавай культуры, здымкі Мерылін Манро і рэкламныя ўлёткі «Кока-Колы»… Што ж выкарыстоўваюць беларускія мастакі? Пра гэта мы запыталіся ў куратара выставы, мастака Сяргея Шабохіна.

**СШ:** Ды тое самае. Высвятляецца, што Гары Потэр больш наш, чым зубры і вышыванкі. Паколькі поп-арт — гэта мастацтва, якое перапрацоўвае масавую культуру, пераважна сусветную, калі нехта пачынае гуляцца чыста беларускімі сімваламі, тое глядзіцца троху прыцягнутым за вушы. Тут адчуваецца подых глабалізацыі.

**«НН»: Ці здольны поп-арт, які перажоўвае мас-культуру, зрабіць чалавека больш развітым у культурным плане, больш мыслячым?**

**СШ:** Вядома, бо ў аснове поп-арту ляжыць крытыка, крытыка грамадства спажывання, яго пустэчы. Напрыклад, вось гэты экспанат, унітаз з ўштукаваным тэлевізарам. Або серыя фотаздымкаў сучаснага беларускага вяселля (аўтар Андрэй Лянкевіч), дзе не засталося аўтэнтычных завядзёнак, адны агульныя месцы, а безаблічная маскультура замяніла традыцыю. Або здымкі пустых рэкламных шчытоў на беларускіх аўтатрасах, якія як бы кажуць: за рэкламным мэсіджам нічога, адно пустата.

***

Акрамя галоўнай выставы, у праект «Філасофія мас. Беларускі неа-поп арт» уваходзяць лекцыі, дыскусіі, сустрэчы з мастакамі, прэзентацыі, дадатковыя выставы.

У рамках фестывалю адбудуцца экскурсіі і лекцыі для дзяцей: у распараджэнні галерэі ёсць дасведчаныя экскурсаводы, здольныя і дзіцяці патлумачыць, чым ёсць поп-арт. Выстава і мерапрыемствы працягнуцца да 20 лістапада.

**ЛК**

ФЕСТЫВАЛЬ

## «Лістапад»: якія фільмы не прапусціць

Прэч крывадушша: ці нам не ўсё адно, каму дастанецца «Залаты лістапад»? Нам цікавей, якія добрыя фільмы пакажуць у Мінску — такія, якіх не пабачыш у звычайным пракаце.

**«Інсайт»**

Беларуская псіхалагічная драма паводле арыгінальнага сцэнара. Пра дзіўны выгін лёсу айчыннага псіхатэрапеўта! Рэж. Рэната Грыцкова.

Сеансы: **20 лістапада ў «Доме кіно» і «Цэнтральным». Пачатак а 12-й і а 19-й адпаведна.**

**«Прарок»**

Цымус «Лістапада» — стужкі, якія ўжо атрымалі сусветнае прызнанне на іншых кінафэстах. «Цэнтральны» прапануе фільм «Прарок» французскага кананосца Жака Адыяра **(18 і 21 лістапада. Пачатак а 21-й)**. Турма як метафара грамадства: свет усярэдзіне турмы і па-за яе межамі ператвараюцца ў адно.

**«Чатыры ночы з Ганнай»**

Фільм леташні, але хто прапусціць драму пра асіметрычнае каханне аўтарства аднаго з найлепшых будаўнікоў трымценных сюжэтаў Ежы Скалімоўскага? **18 лістапада ў «Перамозе». Пачатак у 21.10.**

**«Свет вялізарны і збавенне хаваецца за рогам»**

**«Дом кіно»** пакажа «Свет вялізарны і збавенне хаваецца за рогам» балгарына, такога чалавечнага Стэфана Камандарэва. Атрымаўшы прызнанне сваімі дакументальнымі «Хлеб за плотам» і «Алфавіт надзеі», ён зняў гульнёвы фільм і паспеў з ім праславіцца. **Паказ 19 лістапада. Пачатак а 21-й.**

**Мамонаў — «Цар»**

Ну, і варта наведаць лістапад, каб убачыць фільм «Цар» самага расійскага з цяперашніх рэжысёраў і лаўрэата Канскага кінафэсту Паўла Лунгіна («Выспа» і «Таксі-блюз»). Адметны Пятро Мамонаў як Іван Жахлівы, і апошняя роля трошкі нашага Алега Янкоўскага. **Дом Кіно. Сеансы штодня (16.20, 18.50, 21.30) ад 18 да 22 лістапада.**

**Ліза Кавальчык**

КАНЦЭРТЫ

**Бартосік у Косіна**

**20 лістапада** бард Зміцер Бартосік завітае з канцэртам **у вёску Косіна** Лагойскага раёна. Канцэрт пройдзе **на сцэне вясковага Дома культуры. Пачатак а 19-й.**

**:B:N:**

**20 лістапада а 18-й у R-Club (вул.Сурганава, 26)** — :B:N:. Бяруць удзел: **Kalmary!, IQ48, Krok**

**Дзень студэнта**

**20 лістапада а 18-й у R-club'е** — Дзень студэнта. Удзельнічаюць: **«Разбітае сэрца пацана», Zatoczka, «Гаротніца», ZnaRock, Amaroka, Cukierka.**

**Neuro Dubel у «Рэактары»**

**25 лістапада а 19-й у клубе «Рэактар» (вул.Харужай, 29)** — канцэрт Neuro Dubel'я, прысвечаны 20-годдзю гурту. Пры ўдзеле **Лявона Вольскага, Алега Хаменкі, Вольгі Самусік, Максіма Івашына** і іншых.

**Стары Ольса**

**28 лістапада ў к/з «Мінск»** — канцэрт «Старога Ольсы», прысвечаны 10-годдзю гурту. **Пачатак а 19-й.**

**Сяргей Пукст у «Графіці»**

**20 лістапада а 19-й у клубе «Графіці» (зав.Калініна, 16)** — канцэрт Сяргея Пукста.

**Крама**

**22 лістапада а 19-й у «Графіці»** — канцэрт «Крамы».

**Героі гітары**

**23 лістапада а 19-й у «Графіці»** — «Guitar Hero». Бяруць удзел: **С.Труханові ч («Крама», «Палац»), В.Абрамовіч (Neuro Dubel), А. Хамутоў.**

**Алесь Камоцкі ў Швабах**

Творчая сустрэча з Алесем Камоцкім адбудзецца ў **сельскім Доме культуры вёскі Швабы Лагойскага раёна 27 лістапада. Пачатак а 18-й.**

ІМПРЭЗЫ

**Дзень нараджэння Караткевіча ў Рагачове**

**22 лістапада ў Рагачове** — святкаванне дня народзінаў Уладзіміра Караткевіча. У праграме: экскурсія па мясцінах Караткевіча на Рагачоўшчыне, музычна-паэтычная частка, вогненнае шоу на замчышчы, сувеніры ўдзельнікам святкавання! **Цэнтралізаваны выезд з Мінска ў 7.30 раніцы.** Падрабязнасці праз т.: (029) 537-64-14, (033) 619-60-68.

**Цар Ірад у Гістарычным музеі**

**Да 9 студзеня 2010 года кожную суботу ў Нацыянальным гістарычным музеі (вул.Маркса, 12)** праводзяцца батлеечныя спектаклі. **Ад 12.00 да 16.00**, кожную гадзіну можна пабачыць традыцыйную калядную пастаноўку «Цар Ірад». Кошт білета для дарослых і дзяцей — 2200 рублёў. **18 і 25 лістапада ў 19.00** у музеі пройдзе танцавальны марафон. На працягу гадзіны гурты старадаўняй музыкі **«Пераплут»** і **«Гальярда»** з тэатрам «Гістрыён» пакажуць праграму «Гістарычны танец». Таксама адбудуцца майстар-класы па традыцыйных і сярэднявечных танцах. Кошт білета: для дарослых — 2200 рублёў, для дзяцей — 1100 рублёў.

**Ад неба да паўметра**

**26 лістапада ў ДК МАЗ (Партызанскі пр, 117а)** пройдзе этна-фэст «Ад неба на паўметра–2009». Мэта фэсту — папулярызацыя беларускіх музычных традыцый, падтрымка маладых калектываў і выканаўцаў, якія працуюць ў жанры народнай музыкі. **Пачатак а 18-й.**

**Басданс**

**29 лістапада ў Мінскім дзяржаўным палацы дзяцей і моладзі (Старавіленскі тракт, 41)** пройдзе канцэрт танцавальнага клуба «Басданс» з праграмай «Фолк-экспрэс: Мінск–Берлін–Парыж–Мадрыд–Рым–Эдынбург–Дублін–Нью-Ёрк». **Пачатак а 17-й.**

**Імпрэза, прысвечаная Анатолю Сысу, у Лондане**

Англа-беларускае Таварыства запрашае ўсіх зацікаўленых у беларускай паэзіі на літаратурны вечар, прысвечаны 50-й гадавіне з дня нараджэння беларускага паэта Анатоля Сыса. Вечарына пройдзе **ў Беларускім рэлігійна-культурным цэнтры (39 Holden Road, London N12 8HS) 21 лістапада а 19-й.**

**Турнір па доўгіх нардах**

**23 лістапада ў мінскім клубе «Рэактар»** — турнір па спартыўных доўгіх нардах. **Пачатак гульняў а 10-й.**

ВЫСТАВЫ

**Свет вачыма пацыентаў псіхіятрычнай клінікі**

**У Тэатры беларускай драматургіі (Крапоткіна, 44)** ідзе «Выстава ўсіх». Гэтая падзея адкрывае завэлюмаваныя з'явы актуальнага мастацтва Мінска. Мастацтва, якое існуе за сценамі рэжымнага аб'екта — псіханеўралагічнага інтэрната №3 (Навінкі). «Выстава ўсіх» — экспазіцыя прац пацыентаў інтэрната, непрафесійных мастакоў, якія складаюць касцяк майстэрні «Дом». Дагэтуль мастакі выстаўляліся «паштучна». Напрыклад, Генадзь Грышаль мае ў сваёй творчай скарбонцы дзве персанальныя выставы ў сталічнай галерэі «Падземка», а Міхась Буліч прэзентаваў свае працы на міжнародным фэсце «ДАХ-9». «Выстава ўсіх» — першая спроба аб'яднаць творчасць усіх аўтараў, якія насяляюць майстэрню «Дом», пад адным дахам галерэі. «Цягам года мы збіралі матэрыялы, — кажа арт-куратар Дар'я Яскевіч. — Дэвіянтнае мастацтва — ніколькі не дэвіянтнае… Яно наіўнае, сумнае, пацешнае, звычайнае і проста выдатнае па сваёй сутнасці. Гэта «мастацтва без аглядкі», але з «жаданнем быць». «Выстава ўсіх» будзе цікавая для ўсіх, хто жадае зірнуць за шырму штодзённасці вачыма мастака псіханеўралагічнага інтэрната.

**Падарожжа па мінулым стагоддзі**

**У Мастацкім музеі (вул. Леніна, 20) да 22 лістапада** працягваецца выстава Уладзіміра Тоўсціка «Падарожжа па мінулым стагоддзі». Стылёвы жывапіс, незвычайная манера пісьма, тонкія лініі, чыстыя фарбы. Радасна ўсведамляць, што гэты мастак жыве ў Мінску побач з табой. Абавязкова варта наведаць.

КІНО

## Скон Амерыкі

**2012**

ЗША, 2009, каляровы, 158 хв.

**Рэжысёр:** Рональд Эмерых

**Жанр:** Фільм-катастрофа

**Адзнака:** 6,5 (з 10)




Дапытлівы навуковец адкрывае, што Зямлю чакае маштабная катастрофа, ад якой лусну ць цэлыя кантыненты. Найбольшыя дзяржавы свету ўпотайкі будуюць каўчэгі, а галоўны герой з дзеткамі адпраўляецца ў Елаўстоўнскі парк, дзе катастрофа і пачынаецца.

Рональд Эмерых — рэжысёр «Дня незалежнасці» і абноўленай «Гадзілы» — знаны аўтар відовішчнага кіно. І відовішчаў у фільме задосыць: землятрусы, якія пераследуюць машыну, абвалы мацерыкоў, горы, затопленыя акіянам. У перапынках героі паспяваюць аднавіць сем'і, прызнацца ў каханні. У трохгадзіннай стужцы ёсць месца і гумару: мардаты расійскі алігарх ладзіць канцэрты жлобства, а вар'яцкі ды-джэй вядзе вясёлы рэпартаж з апраметнай.

Рэжысёр ставіць пытанне: «Ці вартае выратаванае чалавецтва слязінкі дзіцяці, задушанага ў чэргах у каўчэг?» — і дае самы маральны адказ, прапагандуючы мір, сяброўства і міжнароднае супрацоўніцтва.

За кінакатастрофамі хаваецца сур'ёзны геапалітычны паварот. Эмерых паказвае канец сусветнага лідэрства Амерыкі: яе прэзідэнт-мурын сентыментальна-гераічна гіне ля Белага дома, ратуючы людзей. Новыя героі — кітайцы, якія будуюць каўчэгі. А чарговая цывілізацыя нараджаецца ў Афрыцы.

**Андрэй Расінскі**



# Канцы свету: розныя прагнозы

Падрыхтоўка да апакаліпсісу цягнецца ад пачатку чалавецтва. Псіхолагі тлумачаць нашу схільнасць да веры ў канец свету тым, што людзі не могуць усвядоміць бясконцасць Сусвету. Гэтая схільнасць ёсць у кожным чалавеку: нават вялікія навукоўцы, як Ісак Ньютан, не былі выключэннем. Прапануем агляд самых папулярных сцэнароў армагедону.

### 21.12.2012 — канец свету паводле календара мая

Каляндар дакалумбавай амерыканскай цывілізацыі мая скончаецца на даце 21 снежня 2012 года. Чаму далей нічога няма? Бо 21 снежня 2012 маюць адбыцца змены ў магнітным полі Зямлі, выкліканыя магутным выпраменьваннем Сонца. Такое бачанне апісалі ў кнізе «Прароцтва Арыёна на 2012 год» Патрык Герыл і Джына Рацінкс. Герыл сцвярджае, што катастрофу перажыве купка людзей. Сам ён збіраецца паехаць у Афрыку і схавацца ў гарах. Праўда, паводле ўяўленняў мая, сонца — гэта бог Танаціу, юнак з тварам чырвонага колеру і палымянымі валасамі. Якія тут электрамагніты?

### 2013 — канец свету паводле NASA

Сонечная бура так скалане Зямлю, што знікне энергетычная сетка. Расплавяцца ўсе трансфарматары, і мы застанемся без электрычнасці. Абваліцца прамысловасць, не будуць працаваць кампутарныя сістэмы, станучь немагчымымі камунікацыі... Спакойна: гэта толькі тэорыя, якую прадставілі навукоўцы з NASA і амерыканскай Нацыянальнай акадэміі навук, абапіраючыся на вывучэнне актыўнасці Сонца. Хоць яны і не кажуць пра смерць чалавецтва, хутчэй, пра вялікія праблемы, калі Сонца будзе сябе паводзіць згодна з іх падлікамі.

### 2036 — канец свету паводле песімістаў

Апофіс — астэроід, які ўдарыць у Зямлю. Хоць навукоўцы з NASA тлумачаць, што гэта немагчыма, але хто ім паверыць пасля фільма «Армагедон»? Паводле прыхільнікаў гэтай тэорыі, калі ў 2029 годзе Апофіс будзе блізкі да Зямлі, наша арбіта можа так на яго паўплываць, што адбудзецца катастрофа. Вялікі выбух — і ўся прастора зямлі апынецца ў цемры.

### 2060 — канец свету паводле Ньютана

Ліст Ісака Ньютана ад 1704 года не пакінуў сумневаў: геніяльны фізік, матэматык, філосаф, даследчык Бібліі сцвярджаў, што канец свету наступіць у 2060 годзе. Гэта ён вывеў, вывучаючы Кнігу Данілы са Старога Запавету. Паводле Ньютана, канец свету надыдзе праз 1260 гадоў пасля пачатку Святарнай Рымскай імперыі (800 год н.э. —каранацыя Карла Вялікага). Так кароль франкаў справакаваў катастрофу галактычнага маштабу. Мог бы каранавацца і гадоў на дваццаць пазней. Калі ж сур'ёзна, гэты прыклад яскрава паказвае, што нават найбольшыя мысляры мінулага не былі вольныя ад забабонаў свайго часу.

### 16.03.2880 — канец свету ў далёкай будучыні

(29075) 1950 DA — гэты малы астэроід яшчэ нават не мае сталай назвы, але можа нарабіць страху сярод нашых нашчадкаў. Хаця верагоднасць таго, што ён сутыкнецца з Зямлёй, усяго 0,33%. За нейкія 800 гадоў знойдуцца тыя, хто не павераць у падлікі сучасных астраномаў, калі, вядома, свет не ляснецца раней ад нечага іншага.

**Вольга Жарнасек**

НАША СТРАВА

### Вінегрэт

**1 кг смажаніны, 2 чырвоныя буракі, 10—15 карнішонаў або 2—3 салёныя агуркі, 1 селядзец, 3—4 яйкі, 6—8 рыжыкаў, 1 сталовая лыжка пікуляў, гарчычны соус з каперсамі або змяшаны з алеем воцат, заліўное або халадзец.**

Вінегрэт гатуецца з align рознага запечанага мяса (смажаніны): дзічыны, птушкі, ялавічыны і г. д.

Мяса парэзаць саломкай уздоўж валокнаў. Асобна дробна парэзаць згатаваныя і ачышчаныя буракі, карнішоны або салёныя агуркі, селядца, яйкі, салёныя або марынаваныя рыжыкі, пікулі. Усё гэта выкласці слаямі на блюдзе і перамяшаць, затым сфармаваць высокую горку, парэзаць кубікамі заліўное (халадзец), абсыпаць гэтымі кубікамі вінегрэт, заліць гарчычным соусам з каперсамі або змешанным з алеем воцатам.

Падчас посту замест мяса можна выкарыстаць вараную рыбу (асётр, шчупак, ласось ці іншая вялікая мясістая).

Замест заліўнога (халадца) можна скарыстацца варанай спаржай. (Толькі яе неабходна трохі вытрымаць у воцаце.)

У вінегрэт таксама добра дадаваць бульбу.

### Гарчычны соус з каперсамі (да вінегрэту)

**5—6 сталовых лыжак гарчычнага парашку, 4—5 жаўткоў, звараных укрутую, 1 сталовая лыжка каперсаў, 2 сталовыя лыжкі дробнага цукру, 2 лыжкі алею. Воцат для распушчання інгрыдыентаў.**

Гарчычны парашок заліць кіпнем, паставіць на агонь, моцна нагрэць, бесперапынна памешваючы, і паставіць масу астываць. Жаўткі расцерці, дадаць цукар, алей, змяшаць гэта з гарчычнай масай, разбавіць воцатам да неабходнай кансістэнцыі (соус павінен быць досыць густым) і працадзіць праз сіта.

Дадаць каперсы.

З кнігі: Вінцэнта Завадская, «Кухарка літоўская»

**Рэцэпты тыдня падрыхтавала і праверыла — пальчыкі аблізала — Наталка Бабіна**

ТЭХНАЛОГІІ

## Кірыліца ў інтэрнэце

Ужо ў наступным годзе ў інтэрнэце з'явяцца сайты, адрасы якіх будуць пісацца кірылічным алфавітам. Расія і Балгарыя атрымалі афіцыйны дазвол ад амерыканскай кампаніі ICANN, што кантралюе прастору адрасоў у сеціве.

Калі ж інтэрнэт-рэвалюцыя дойдзе да нашай краіны і сайт «НН» будзе даступны па адрасе нн.бел?

«Пытанне аб стварэнні беларускага нацыянальнага кірылічнага дамена абмяркоўваўся з ICANN яшчэ ў пачатку 2009 года, — кажа кіраўнік упраўлення электрасувязі Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Юрый Шпак. — Мы выказалі зацікаўленасць у стварэнні кірылічнага дамена .РБ альбо .БЕЛ на працягу аднаго-двух гадоў».

**Ягор Марціновіч**

КАЛЯНДАР

## Дзень студэнта

17 лістапада святкуецца Міжнародны дзень студэнта. І як бы ён ні пачаўся — усё адно скончыцца, як летась, кажуць студэнты. У Беларусі 17 лістапада традыцыйна праходзіць ў форме ўручэння першакурснікам студэнцкіх білетаў і разгульнага свята ў інтэрнатах. Выкладчыкі скрозь пальцы глядзяць на наведвальнасць у гэты дзень.

Студэнтам можна нагадаць тры правілы святкавання: «не змешвай напоі», «памятай, што заўтра на пары» і «не губляй галавы». Бо Дзень студэнта — не апошні дзень у жыцці.

На жаль, рэдка ўзгадваюць велічную гісторыю гэтага свята. 28 кастрычніка 1939, на Дзень незалежнасці, студэнты і выкладчыкі выйшлі на вуліцы акупаванай нацыстамі Прагі. Дэманстрацыю жорстка разагналі нацысты. Быў застрэлены студэнт Ян Оплетал. Пахаванне перарасло ў акцыю пратэсту. Дзесяткі студэнтаў былі арыштаваны. 17 лістапада нацысты штурмавалі інтэрнаты Праскага ўніверсітэта. Дзевяць студэнтаў былі публічна пакараныя смерцю, больш за 1200 адпраўленыя ў канцлагеры, а ўніверсітэт быў зачынены.

17 лістапада 1941 у Лондане, падчас сустрэчы студэнтаў, якія змагаліся супраць фашызму, было вырашана адзначаць гэтую дату як Міжнародны дзень студэнта.

17 лістапада 1989 студэнты Прагі падтрымалі акцыю супраць камуністычных уладаў, што стала пачаткам «аксамітнай рэвалюцыі». Сёння гэты дзень адзначаецца ў Чэскай і Славацкай рэспубліках таксама як Дзень змагання за свабоду.

**Настасся Шамрэй**

ЗДАРОЎЕ

## Каб хурма не вязала

**Хурма — адзін з самых карысных пладоў. З ёй не зраўнаюцца нават яблыкі. Часта яна вяжа. Аднак яе можна лёгка і без страты якасцяў давесці да спеласці.**

Бывае звычайная хурма, а бывае «каралёк». Звычайная губляе даўкі прысмак толькі калі цалкам саспее і яе мякаць зробіцца, нібы жэле. А вось «каралёк» не вяжа зусім: ён салодкі, нават калі трохі недаспелы.

Глядзіце на пладаножку: яна павінна быць сухой, бурага колеру. «Каралёк» можна вызначыць па цёмна-рудым колеры скуркі і карычневай, з цёмнымі пражылкамі мякаці. Зазвычай гэта невялікія круглыя плады.

Спелая хурма павінна быць мяккай, з гладкай, бліскучай, тонкай напаўпразрыстай скуркай.



**Ёсць некалькі спосабаў дапамагчы хурме даспець**

1. Пакласці яе ў адзін цэлафанавы пакет з яблыкамі ці памідорамі — яны выдзяляюць газ этылен, які дапаможа хурме даспець.
2. Пракалоць цвёрдыя плады іголкай, змочаной у спірце.
3. Даўкую хурму можна замарозіць ці высушыць. Сушаная хурма зусім не вяжа, пакуль яе зноў не намочыш.

### Чаму карысна есці хурму

Лацінская назва яе diaspyros перакладаецца як «ежа багоў». Яна ўтрымлівае ў два разы больш харчовых валокнаў і карысных мікраэлементаў, чым яблыкі. У ёй шмат антыаксідантаў, хурма багатая каліем, кальцыем, магнием, фосфарам, жалезам, а таксама вітамінамі A, C і P.

Хурма карысная пры страўнікавых захворваннях. Яна сілкуе сэрца. Аднак не варта ўжываць хурму пры дыябеце. Хурма мае мачагоннае дзеянне і танізуе. Супакойвае нервы і павялічвае працаздольнасць.

**Настасся Шамрэй**

ГАЗЕТКА ДЗЕТКАМ

Коцік-варкоцік
Лёг на жывоцік.
Лапкі пад вушка —
не трэба падушка.

**Ніна Галіноўская**

Больш дзіцячых вершаў — на nastaunik.info




БЫВАЕ І ТАКОЕ

## Удзельнікі філасофскага форуму пабіліся

У Цэнтральным Доме вучоных Расійскай Акадэміі Навук у Маскве пабіліся ўдзельнікі Міжнароднага філасофскага форуму. На месца здарэння нават было выслана некалькі нарадаў міліцыі. Канфлікт, што перарос у бойку, пачаўся падчас адной з дыскусіяў паміж удзельнікамі форуму. Пацярпелі двое — мужчына і жанчына. У аднаго з пацярпелых гематома, у іншага — драпіны твару.

**газета.ру**

ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

ВІТАННІ

**Віншуем Яраслава Берніковіча** з Днём народзінаў. Жадаем поспехаў у рэалізацыі новых пачынанняў, моцнага здароўя. Сябры.

**Віншуем Галіну Яшчанку і Сержа Наўродскага** з нараджэннем сына Настася! Хай гэта вырасце чалавек-унікум! Сябры.

**Віншуем Мілану і Алеся Міхалевічаў** з нараджэннем дачкі. Хай будзе разумнай, прыгожай, паслухмянай і здаровай. Сябры.

**Віншуем Аляксандра Фядуту** з 45-годдзем. Зычым поспехаў у працы дзеля культуры і дзеля палітыкі. Сябры з Гродна.

КОТКІ

**Чатыры коткі-сястрычкі шукаюць добрага гаспадара.** Дастаўка на дом у межах Мінска гарантуецца. Т.: (29) 288-27-32 (МТС). Павал.

**Прыватныя абвесткі ў «НН»** (не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e-mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!



**Беларускі Махамед Алі — так можна назваць Юрыя Формана. У суботу ў Лас-Вегасе (ЗША) ён заваяваў тытул чэмпіёна свету па версіі WBA у першай сярэдняй вазе. Юры перамог уладальніка тытула, пуэртарыканца Даніэля Сантаса, адзінагалосным рашэннем суддзяў. Форман нарадзіўся 5 жніўня 1980 г. у Гомелі, жыве ў Брукліне (Нью-Ёрк, ЗША). Яўрэйская дыяспара лічыць яго сваім, але ўсім беларусам таксама прыемна.**




**Знакаміты ксёндз Ёзас Булька ў рэанімацыі. У яго дыягнаставалі ачаговы інфаркт міякарду. Ё.Булька набыў вядомасць найперш як змагар з п'янствам. Шмат турыстаў прыязджае ў Мосар, каб паглядзець унікальны парк вакол касцёла, створаны ксяндзом. Стаў ксёндз і героем медыйнага скандалу — перад тым як стаць святаром, ён спачатку ваяваў супраць саветаў, а трапіўшы ў палон, стаў спецагентам і забіваў ужо «лясных братоў».**



**З'явіўся новы мультфільм з удзелам персанажа, падобнага да кіраўніка Беларусі. Прычым зрабілі яго не нейкія падпольныя кустары, а першы канал расійскага тэлебачання ў праграме «Мультасобы».**




**На сёлетнім кінафестывалі «Лістапад» галоўную ўзнагароду атрымаў беларус. Спецыяльны прыз ад А.Лукашэнкі «За захаванне і развіццё традыцый духоўнасці ў кінамастацтве» ўручылі актору Купалаўскага тэатра і кіно Генадзю Гарбуку.**




## АНЕКДОТЫ

***

У залежнасці ад інтанацыі адно слова аўтамайстра Кавалеўскага можа пазначаць да 50 розных дэталяў і прыстасаванняў.

***

— Сяржант Пятрэнка. Малады чалавек, вы нецвярозы!

— Чаму гэта я нецвярозы? Вось аптэчка, тэхпашпарт, вось рэмень бяспекі зашпілены.

— Вы будзеце галаву дурыць сяржанту ДАІ?! Вы нецвярозы!

— Камандзір, давай разбірацца. Аптэчка ёсць?.. Тэхпашпарт ёсць?.. Рэмень? Нават ручнік ёсць. Чаго гэта я нецвярозы?!

— Машына дзе?..

***

У рэстаране афіцыянт ссоўвае сталы. Да яго падыходзіць другі і пытаецца:

— Што, банкет будзе?

— Ды не, кліент замовіў шыйку жырафы...

***

Хлопчык-вычварэнец прачытаў Дзеду Марозу з табурэткі ўсяго Куляшова.

***

— Як ты дастала такога ідэальнага мужа?

— Як, як... Я не адыходзіла ні на крок, увесь час клапацілася, давала правільныя парады па ўсіх пытаннях... і дастала.

***

У заапарку скандал: дырэктар правёў па дакументах дохлага слана як сонныга і цэлы месяц атрымліваў яго грошы на харчаванне!

## «НН» 100 ГАДОЎ З ВАМІ

**Астрамечава (пад Брэстам).** З аграномічнага бюро (Пецярбург) высылаліся бясплатна мінеральныя (штучныя) гнаі для сялян, каб зрабіць спробы на сваіх палетках. На полі з аўсом на суперфасфаце мы атрымалі большы ўраджай на 40 руб. 50 кап. Чысты даход, калі аблічым кошт суперфасфату, будзе 34 р. 20 к. Эксперымент з жытам не ўдаўся, бо пакралі снапы з поля.

**НН. №46. 1909**

**Банкаматы ў Горадні.** На гарадзенскім «Азоце» пачалі выплочваць заробак на магнітныя карткі. За грошы, што ляжаць на картцы, аўтаматычна налічваюць працэнты. Калі ж згубіш, дык трэба адразу пазваніць на нумар, які будзе дзень і ноч працаваць, і сказаць: тады картку адразу заблакуюць. Зручна, бо не трэба цягаць за сабой торбу з лукашэнкаўскімі рублямі. Як у Еўропе: там усе на картках жывуць.

**НН. №31. 1999**

**Наша Ніва**

незалежная газета

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| шэф-рэдактар | Андрэй Дынько |
| галоўны рэдактар | Андрэй Скурко |
| заснавальнік | Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы» |
| выдавец | Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №248 ад 22 чэрвеня 2009 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, вул. Асаналіева, 15–128. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

Наклад 6195. Газета выдаецца 48 разоў на год.

Нумар падпісаны ў друк 23.00 17.11.2009.

Замова № 6336.

Рэдакцыйны адрас: Асаналіева 15–128.

Цана дамоўная.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

ISSN 1819-1614
9771819161008 09043